ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЧАЦВЕР, 23 ЛЮТАГА 1939 г. № 10 (424)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

МАГУТНАЯ АРМІЯ СОВЕЦКАГА НАРОДА

У дні барацьбы не на жыццё, а на смерць з насядаўшымі на маладую Совецкую рэспубліку ворагамі Уладзімір Ільіч Ленін гаварыў чырвонагвардзейцам, якія ад'язджалі на фронт:

— Для тых, хто адпраўляецца на фронт, як прадстаўнікі рабочых і сялян, выбару быць не можа. Іх лозунг павінен быць — смерць альбо перамога.

Смерць альбо перамога — другога выбару не было для нашага народа ў барацьбе з шматлікімі белымі бандамі, з узброенымі да зубоў арміямі інтэрвентаў. Партыя большэвікоў пасылала на франты тысячы лепшых сваіх сыноў. Пасланцы партыі — большэвіцкія палкаводцы і камісары цэментыравалі раздробленыя чырвонагвардзейскія і партызанскія атрады ў жалезныя палкі і дывізіі рэгулярнай Чырвонай Арміі. Створаная ў гэтыя дні — у лютым 1918 года — армія совецкага народа ператварылася ў грозную і несакрушальную для ворага сілу.

Знясіленыя голадам, змучаныя і разутыя, сыны нашай радзімы — чырвоныя воіны рэволюцыі ў імя соцыялізма рвалі абмарожанымі рукамі калючыя драцяныя загародкі, прабіваліся скрозь кулямётныя ліўні, скрозь лясы белаказацкіх пік — і перамагалі. Аб гэтых днях паэт Нікалай Тіханаў сказаў, што нават —

«Мертвые, прежде чем упасть, делали шаг вперед».

Рэволюцыйная адвага народа, яго невычарпальная вера ў сваю перамогу выратавалі лёс рэволюцыі. У разгроме нямецкіх акупантаў, у тысячавёрстых рэйдах будзённаўскай конніцы, у баях за Царыцын, на Кахоўскім плацдарме, у нястрымным наступе на Варшаву пакрылі сябе вечнай славай байцы і камандзіры вялікай арміі совецкага народа.

Дарагой цаной заплаціла наша радзіма за сваю перамогу. Тысячы народных герояў загінулі ў баях за свабоду. Расціснутыя танкамі, узятыя на прыцэл марцірамі, прадзіраўленыя кулямі, аддалі сваё жыццё за соцыялізм тысячы металістаў Пітера, шахцёраў Данбаса, ткачоў Іванава-Вазнясенска. Дзесяткі тысяч беднякоў і батракоў сібірскіх, украінскіх, беларускіх, кубанскіх сёл навекі засталіся ў мутных водах Сіваша, на палях паўночнай Таўрыі, пад сценамі Львова.

Памяць аб гэтых бясстрашных і мужных героях грамадзянскай вайны навекі застанецца ў сэрцы народа. Славай і любоўю авеяны іх магілы, славай і любоўю акружаны імёны народных герояў Васілія Чапаева і Нікалая Шчорса. У песнях і легендах сваіх услаўляе народ вернага сына радзімы Сяргея Лазо, спаленага японцамі ў паравознай топцы, славутага камандзіра будзённаўскай арміі Івана Дундзіча, аб якім Клімент Варашылаў сказаў, што гэта быў «леў з сэрцам малога дзіцяці». Ніколі не змеркне слава большэвіка-палкаводца Грыгорыя Катоўскага, паўшага ад здрадніцкай кулі.

Кроў, пралітая совецкім народам у барацьбе з ворагамі соцыялізма, не прапала дарэмна, яна дала багатыя ўсходы. У краіне Советаў, ачышчанай ад белагвардзейскай погані і інтэрвентаў, пабудавана шчаслівае і радаснае жыццё. З выкананнем сталінскіх пяцігодак з дня ў дзень пераможна разгортваюцца сілы комунізма, у дружбе і адзінстве жывуць сагрэтыя Сталінскай Канстытуцыяй народы СССР. Смела і ўпэўнена, колькі-б ні шалелі фашысцкія разведкі і іх трацкісцка-бухарынскія найміты, ідзе наша радзіма к комунізму, смела і ўпэўнена глядзім мы ў свой заўтрашні дзень.

Чырвоная Армія, верная вялікім традыцыям грамадзянскай вайны, заўсёды гатова сустрэць любога ворага знішчальным агнём сваёй выдатнай тэхнікі. І ў тую-ж мінуту, калі фашысты асмеляцца парушыць спакой чырвоных граніц, зямля здрыганецца ад смерцяноснага агню чырвонай пяхоты, ад тупату нашай імклівай конніцы, ад грукату артылерыйскай кананады. З паветра, з зямлі, з безбярэжных прастораў мараў сустрэнем мы ворага нябачаным яшчэ нідзе і ніколі шквалам агню і смерці. Уся сіла нашага гневу і нянавісці, уся моц нашай тэхнікі, усё, нават камні з нашага бруку, абрушацца на ворага. Фашысты будуць разбіты, знішчаны, сцёрты ўшчэнт на іх уласнай тэрыторыі.

Акружаная клопатамі і штодзённай увагай вялікага Сталіна, моцная любоўю ўсяго совецкага народа Чырвоная Армія не раз давала падпальшчыкам вайны наглядны ўрок мірнай палітыкі СССР, не раз і не два даказала ім, што ніколі не здзейсняцца іх мары аб землях совецкага Прымор'я і Сібіры, аб багаццях Урала, аб ураджайных стэпах Кубані і Украіны. Калі японскія налётчыкі забылі ўрокі 1929 года і парушылі нашы граніцы, Чырвоная Армія напомніла ім у 1938 годзе ў раёне возера Хасан, што некаторым нашым не зусім разумным суседзям лепш за ўсё жыць у міры і згодзе з вялікім Совецкім Саюзам, інакш іх чакае разгром і пагібель.

Невычарпальны сілы совецкага народа і яго арміі, непераможна тэхніка соцыялізма. Кожны год у Чырвоную Армію прыходзяць выконваць свой самы пачэсны доўг і абавязак—абараняць сваю радзіму — тысячы маладых совецкіх грамадзян: рабочых, калгаснікаў, інтэлігентаў. Кожны з іх лічыць для сябе справай гонару апраўдаць давер'е партыі, урада, жалезнага наркома абароны Клімента Варашылава, кожны з іх моцна і ўмела трымае ў руках даверанную яму зброю. Лепшыя сыны радзімы — камандзіры і камісары выхоўваюць байцоў Чырвонай Арміі, вучаць іх бязмежна любіць Радзіму, любіць свой народ.

Сёння Чырвоная Армія, яе воіны прысягаюць Радзіме, вялікаму правадыру комунізма таварышу Сталіну, маршалу Совецкага Саюза Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву, што яны будуць, не шкадуючы жыцця, стаяць на варце нашых граніц, бясстрашна служыць свайму народу, аберагаць ваенную тайну, нястомна авалодваць тэхнікай. Сёння, з любоўю і пашанай аглядаючы свае ўзброеныя сілы, сваю армію і ваенна-марскі флот, совецкі народ яшчэ раз напамінае ўсяму свету: у нас ёсць што абараняць, ёсць каму абараняць і ёсць чым абараняць. Увесь народ знаходзіцца ў стане пастаяннай мабілізацыйнай гатоўнасці. Нашы байцы, камандзіры, палітработнікі да канца адданы соцыялізму і гатовы адстойваць яго заваёвы. Нашы самалёты за адны суткі пералятаюць з Масквы на Далёкі Усход. Караблі і падводныя лодкі нашага флота надзейна сцерагуць велізарныя марскія граніцы Совецкага Саюза. Усімі відамі ўзбраення багата аснасціла соцыялістычная радзіма сваю армію, лепшых сваіх сыноў пасылаюць партыя і народ яе камандзірамі, камісарамі. У трэцяй сталінскай пяцігодцы яшчэ больш узрастуць узброеныя сілы краіны Советаў.

Нязменнай дружбай, 16 гадовым шэфствам звязаны з Чырвонай Арміяй лепшыя артысты, кампазітары, драматургі, прадстаўнікі ўсіх відаў мастацкай творчасці. Яны прысвячаюць нашай арміі свае самыя лепшыя спектаклі, кінофільмы, канцэрты. Зараз па ўсяму СССР з велізарнейшым поспехам праходзіць дэкада мастацтваў, прысвечаная 21-й гадавіне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Дэкада ператварылася ў калектыўную творчую справаздачу работнікаў мастацтваў перад Чырвонай Арміяй. З вялікім размахам і ўздымам праходзіць дэкада мастацтваў у нашай рэспубліцы.

Вялікі совецкі народ ганарыцца сваёй арміяй. Мы можам не баяцца капіталістычнага акружэння, бо нашага пабеданоснага руху к комунізму не зможа спыніць ні адна варожая сіла.

КЛЯТВА

ЯКУБ КОЛАС

Прад народам і радзімай
Клятвай вернай, нерушымай
Паклянуся я.
Сцерагчы маю краіну,
Як мой скарб святы, адзіны,
Паклянуся я.
Вартаваць яе граніцы,
Як вачэй сваіх зяніцы,
Паклянуся я.
Для яе спакою, волі
Не жалець сябе ніколі
Паклянуся я.
Для яе красы і славы
Чэсна ў бой ісці крывавы
Паклянуся я.
Хто-б і дзе-б ні быў злы вораг.
Біць яго на сушы, моры
Паклянуся я.
І захоўваць тайну свята
Ад людзей ліхіх, зацятых
Паклянуся я.
Быць заўсёды беззаганным,
Доўг свой помніць пастаянна
Паклянуся я.
Клятву споўніць нерушыма
Перад Сталіным, радзімай
Прысягаю я.

21.II-39 г.

Н. ШЫДЛОЎСКІ

Я—РАДЗІМЫ ВАРТАВЫ

Адпалыхаў гарачы дзень,
У твар твой дзьмухнуў свежы вецер,
Бярозы адкідалі цень
І на зямлю спускаўся вечар.
Час развітання надышоў,
Ты да грудзей маіх прыпала,
Для ласкі нехапала слоў,
І часу нават нехапала.
А зараз пішаш ты ў пісьме,
Каб быў я храбры, стойкі воін,
Прарваўся праз агонь і смерць
І перамог на полі боя.
Я стаў, радзімы вартавы,
Ахоўваць гарады і поле.
Традыцый слаўных баявых
Клянуся не забыць ніколі,
Аддана край свой бараніць
Клянуся я — і клятва гэта
У маёй сардэчнай глыбіні
Вялікім Сталіным сагрэта.
Калі-ж краіна дасць загад
І ўстануць ля граніц народы —
Клянуся не ступіць назад,
Аддаць ёй свой апошні подых!

Пераклад з рускай мовы К. Ц.

„Партыя ганарыцца, што Чырвонай Арміі ўдалося з чэсцю прайсці цяжкі шлях найжорсткіх баёў з унутранымі і знешнімі ворагамі рабочага класа і сялянства нашай краіны, што ёй удалося аформіцца ў найвялікшую баявую рэволюцыйную сілу на страх ворагам рабочага класа, на радасць усім прыгнечаным і падняволеным". **(Сталін)**

В. І. ЛЕНІН, І. В. СТАЛІН і К. Е. ВАРАШЫЛАЎ ЗА КАРТАЙ.
Рысунак мастака П. Васільява.

ВАЕННАЯ ПРЫСЯГА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

„Я, грамадзянін Саюза Совецкіх Соцыялістычных рэспублік, уступаючы ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, прымаю прысягу і ўрачыста клянуся быць чэсным, храбрым, дысцыпліраваным, пільным байцом, строга захоўваць ваенную і дзяржаўную тайну, беспярэчна выконваць усе воінскія статуты і загады камандзіраў, камісараў і начальнікаў.

Я клянуся добрасумленна вывучаць ваенную справу, усямерна берагчы ваенную і народную маемасць і да апошняга дыхання быць адданым свайму Народу, сваёй Совецкай Радзіме і Рабоча-Сялянскаму Ураду.

Я заўсёды гатоў па загаду Рабоча-Сялянскага Урада выступіць на абарону маёй Радзімы—Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і, як воін Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, я клянуся абараняць яе мужна, умела, з дастоінствам і чэсцю, не шкадуючы сваёй крыві і самога жыцця для дасягнення поўнай перамогі над ворагамі.

Калі-ж па злому ўмыслу я парушу гэту маю ўрачыстую прысягу, то няхай мяне пасцігне суровая кара совецкага закона, усеагульная нянавісць і прэзрэнне працоўных".

Подвіг пагранічніка Нікіты Карацупы

Аркадзь ГЕЙНЕ

Ён прызначаны быў у нарад;
З ім Індус, яго верны таварыш.
Трыста крокаў уперад-назад..,
Цішыня—чутны сэрца ўдары.

Неба змрочнага чорны навес
Разасланы над соннай тайгою.
Повен цемры таежны лес,
І, як сцены,—высокія хвоі.

Трыста крокаў уперад-назад...
Асцярожны, напружаны крокі,
Кожны куст на ўвагу ўзят.
Толькі лес той далёкі, шырокі!..

Цяжка вывучыць кожную цень,
Кожны шорах таежных бяздонняў:
Можа, дзесьці прамчаўся алень?
Ці каза закрычала спрасоння?..

А, быць можа, то вораг цішком
Запаўзае у нашы абшары,
Стаўшы ў цемрадзі пнём ці кустом?
І тады выручае таварыш.

Так і зараз. Маўкліва кругом,
Толькі нешта Індус неспакоен;
Ён нервова віляе хвастом
І Нікіту вядзе за сабою.

Неразлучныя сябры ўдваіх
Кілометраў шаснаццаць прабеглі.
Раптам — шум між галінак сухіх...
На ўзгорку паросшым залеглі.

Паглядзеў з вышыні пад сабой
У лагчыну глухую Нікіта
І, агорнутых цемрай начной,
Многа-многа убачыў бандытаў,

І падумаў: «Цяжкі будзе бой...»
Толькі некалі думаць!—адкрыўся
На ўвесь рост, і магутнае—«Стой!»—
Прагучала, і ціха «кладзіся!»...

Схамянуўся бандыцкі прытон,
Да зямлі папрыніклі бандыты.
І, узяўшы начальніцкі тон,
Закамандаваў «атрадам» Нікіта:

«— Іванову — чатыры узяць
На прыцэл, быць да бою гатовым!
Сідарэнку — сярэдніх пяць!
А астатніх — атраду Пятрова!»

Цьма вакол. Кожны куст—вартавым,
Кожны пень кулямётам здаецца;
Нават подых таежнай травы
Чалавечымі сэрцамі б'ецца.

І трусліва бандыты ідуць
Пад адной толькі вартай нагана.
Побач—з грозным аскалам Індус
І Нікіта — за бандай спайманай..

По совецкай зямлі не блудзіць,
Не глуміць, не таптаць яе гадам,
Не прайсці ім туды, дзе адзін
Замяняе сабою атрады.

НАД РАКОЙ

Анатоль АСТРЭЙКА

Ледзь шавеліцца лісце ракіт,
І суцішана Нёман плюскоча.
Выйшаў месяц на ясны блакіт —
Прагуляцца па чэрвеньскай ночы.
Белым ценем упалі ў ваду,
Нібы пух серабрысты, праменні.
І паціху звіняць і гудуць
Ля аіру густога струмені.
І спынілі гамонку лясы
Пад празрыстым святлом месяцовым,
І аселі крупінкі расы
На кустах і на травах мядовых.
Беразняк над ракою заснуў,
Пахіліўшы купчастае вецце.
Хто не любіць красуню-вясну,
Калі месяц так хораша свеціць!
Чуцен гучна і дзяцела стук
Ля дупла загрыбелай асіны.
І стаяць на адказным пасту
Вартавыя совецкай краіны.
Яны сон і спакой берагуць,
І дзявочую ўсмешку ля хаты,
І таму кожны шолах і гук
На прыцэл пагранічніка ўзяты.
Вось і месяц між хмар патануў,
І ў суцёмках вада не ільсніцца.
Я вітаю жыццё і вясну
І нястомную зоркасць граніцы.

А. БЯЛЕВІЧ

ВАРТАВЫЯ НАШЫ НА ГРАНІЦЫ

Дрэмле ноч над параснікам ніцым,
Таямніча шэпча стромкі гай.
Вартавыя нашы на граніцы
Сцерагуць совецкі родны край.

Пахне багунамі і смалою,
Над граніцай ціш і супакой,
Ды байцы не вераць супакою —
Вораг люты ходзіць за ракой.

Туліцца да кусціка, да дрэва,
Прыпадае к долу, к травам ніц.
Толькі пагранічнікі не дрэмлюць,
Вартавы Малееў не засніць.

І ў спакой, і ў дзікую завею
Кожны шолах лісціка, травы
Распазнаць заўсёды ён сумее,—
Вострыя слых і зрок у вартавых.

А ці воўчы след, ці чалавечы,
Ці капыты лося, ці каня—
Вартавыя зоркія прыкмецяць,
Выкапаюць гадзіну з-пад пня.

**

Спіць зялёны лог, і дрэмлюць хвоі,
І плывуць туманы над ракой.
Дыверсанты крадуцца са зброяй,
Са смяротнай воспай і чумой.

Лезуць праз маўклівую граніцу,
Лезуць праз канаву, топкі брод.
... Замутнела чыстая крыніца,
Зашумеў стрывожаны чарот.

Патаптаны травы ля крыніцы,
Не іскрацца срэбнаю расой.
Смерць зірнула ў вочы чужаніцам,
Як сказаў Малееў ціха:—Стой!..

Зашумелі буйныя таполі,
Разгубілі лісце па вадзе.
Адазваўся рэхам бор і поле..
Наступаў ліпнёвы ясны дзень.

Гай цяністы свежасцю павеяў,
І паліўся птушак пераевіст.
Ворагаў к заставе гнаў Малееў,
Баявы праслаўлены чэкіст.

ТАНКІСТЫ

ВАДЗІЦЕЛЬ РУЗІН

Падраздзяленне, якім камандуе старшы лейтэнант тав. Харкоў, цалкам складаецца з комсамольцаў. Комсамольцы абавязаліся прыйсці к XVIII з'езду ВКП(б) толькі з добрымі і выдатнымі паказальнікамі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Падведзеныя днямі вынікі паказалі, якіх выдатных поспехаў дабілася комсамольскае падраздзяленне. У слаўнай шарэнзе перадавікоў першае месца належыць слесару ў мінулым, а зараз майстру-вадзіцелю баявой машыны комсамольцу тав. Рузіну.

Днямі тав. Рузіна правяралі па тэме: «Утварэнне рускай нацыянальнай дзяржавы». На пытанне правяраючага аб прычынах умацавання Масквы і Маскоўскай дзяржавы ён адказаў гэтак-жа чотка, нібы рабіў прывычны разварот сваёй баявой машыны. Ні кроплі замяшання!

Тав. Рузін першым у групе атрымаў выдатную адзнаку па палітпадрыхтоўцы. Машына яго заўсёды напагатове. Ні разу за дзесяткі гадзін ваджэння не ведаў ён, што такое паломка, ці хоць вымушаная астаноўка.

— Не падкачае! — гаворыць камандзір узвода.

— Усюды праверціца, для яго няма перашкод... — гавораць таварышы.

ВАДЗІЦЕЛЬ ЮРЧАНКА

Комсамолец тав. Юрчанка ў полі, у класе, на стрэльбішчы — усюды паказвае ўзоры ўпартасці, знаходлівасці і смеласці ў дасягненні пастаўленай мэты. У ім шчасліва спалучаюцца веданне матэрыяльнай часткі машыны з асаблівай практычнай кемлівасцю. Нядаўна ўзвод выконваў складаны 40-кілометравы марш ва ўмовах слізготы і ветра, з вырашэннем тактычнай задачы. Тав. Юрчанка не толькі шпарка і ўпэўнена вёў танк, але ўважліва назіраў за мясцовасцю.

— Управа ад дарогі, ля асобнага дрэва, процітанкавая гармата! — перадаў ён камандзіру.

Не прайшло і некалькіх хвілін, як процітанкавая «гармата» была «знішчана». Танк пасоўваўся па асобных участках абледзянелых прасёлкаў, прадзіраўся скрозь гушчары хмызнякоў. Іншы раз здавалася, што танк некуды праваліваецца. Трапляючы ў канавы, майстэрска замаскіраваныя снегам, танк нагадваў лодку ў часе навальніцы на моры. Але тав. Юрчанка ўвесь час рабіў удалыя развароты, то даваў газ, то тармазіў машыну. Калі-ж выбраліся з лесу, дарогу перагарадзіла рэчка. Бераг быў круты. Пераязджаць у гэтым месцы азначала альбо вывесці са строю машыну, альбо выехаць з паломкамі..

Рэзка ўзяўшы ўлева, тав. Юрчанка з кілометр праехаў па берагу. Каля моста, які быў «узарван» па абстаноўцы, бераг быў менш круты. Зламаўшы лёгкі наздраваты лёд і ўзняўшы фантан пырскаў, тав. Юрчанка перайшоў тут рэчку і лёг на ранейшы курс. На зборны пункт ён прыбыў у час.

ЭКІПАЖ КРАЎЦОВА

Асабліва вялікіх поспехаў у баявой згуртаванасці і зладжанасці дабіўся комсамольскі экіпаж тт. Краўцова, Нікіціна і Юханава. Днямі камандзір падраздзялення абвясціў баявую трывогу. Шпарка апусцеў інтэрнат. Хутка без мітусні і гаворак, запраўляліся машыны. Кожны экіпаж спаборнічаў з другім. Але згуртаванасць экіпажа тав. Краўцова аказалася і на гэты раз лепшай.

Хаця ўсё падраздзяленне было гатова да вырашэння баявой задачы ўдвая хутчэй, чым палажана па нарматывах, тав. Краўцоў раней за ўсіх падышоў з дакладам.

У гэтым экіпажы з поўслова разумеюць адзін другога. Дружная баявая тройка выканала без перастрэлкі сем апошніх стрэльбаў з выдатнай ацэнкай.

Быў такі выпадак. Выконвалі задачу па стральбе з вінтоўкі. Вадзіцель тав. Усцінаў, не выканаўшы задання, скептычна махнуў рукой:

— Усё правільна рабіў... Вінтоўка не прыстрэлена, ясна...

— Кінь! — сказаў стаяўшы побач тав. Краўцоў. — Проста ты яшчэ ліпавы стралок і дарэмна вінаваціш вінтоўку.

Тав. Краўцоў узяў з яго рук вінтоўку і лёг на агнявы рубеж. Спакойна паглядзеў на далёкую цьмяную пляму мішэні і прыцэліўся.

— Куды трапіць, кажы?..

— Ды хоць-бы ў васьмёрку...

Пачуўся стрэл. Куля легла ніжэй яблычка, у кругу восем.

— Гэта выпадкова, — не здаваўся тав. Усцінаў.—Давай цяпер дзесятку..

— Калі ласка... — адказаў тав. Краўцоў. Зноў стрэл — і куля ў чорным яблычку дзесяткі. — А каб ты ніколі не вінаваціў вінтоўку, трэцюю кулю я пашлю ў дзевятку. Трэцюю кулю ён усадзіў паміж двума прабоінамі.

Мішэнь з трыма прабоінамі пайшла па руках. А тав. Усцінаву нічога не заставалася, як легчы і выканаць практыкаванне.

П. СЛЕСАРЭУ.

РАБОЧЫЯ, СЯЛЯНЕ, УВЕСЬ САЮЗ—І ЎДЗЕНЬ І ЎНОЧ РЫХТУЙЦЕ АБАРОНУ!

В. В. МАЯКОЎСКІ.

Ноч на заставе

(УРЫВАК З АПОВЕСЦІ «НА ГРАНІЦЫ»)

Да начальніка пагранічнай заставы, запыхаўшыся, бяжыць стары калгаснік Нічыпар. Вось ён ужо падбег да брамы і спрабуе адчыніць калітку, але пагранічнік затрымаў яго.

— Пусці! — крычыць Нічыпар. — Будзеш адказваць. Я да начальніка па вельмі важнай справе.

Пагранічнік ведаў Нічыпара як актыўнага калгасніка, ведаў, што ён многа разоў дапамагаў затрымліваць шпіёнаў, але прапусціць без дазволу начальніка не мог.

— Не магу, дзядзька Нічыпар, —апраўдваецца пагранічнік, — дысцыпліна ў нас такая.

— Дысцыпліна—дысцыплінай,—спрачаецца Нічыпар, — а пусціць чалавека трэба, тым больш, што ў мяне тэрміновая справа.

У гэты час з'явіўся дзяжурны. Ён адразу пазнаў Нічыпара і, убачыўшы яго занепакоены твар, спытаўся, што яму трэба на заставе.

— Да начальніка, па важнай справе, — адказаў Нічыпар. — але вось ён, — Нічыпар паказаў на пагранічніка, — упёрся і не пускае.

Дзяжурны прапусціў Нічыпара да начальніка.

— Тота-ж! Даўно-б так, — смяецца Нічыпар. — Вы павінны вароты расчыняць, калі Нічыпар ідзе, — без справы ён да вас хадзіць не стане.

Увайшоўшы ў габінет, Нічыпар забыўся нават прывітаць начальніка і, як спрактыкаваны камандзір, скамандаваў:

— Па конях, таварыш начальнік!

— Я не разумею, у чым справа, Нічыпар?

— Аб гэтым пасля, а цяпер — па конях!

— Што здарылася? Прычым тут коні? Гавары толкам, — непакоіўся начальнік.

— Падазроная асоба перайшла вось там, ля Дубяг. Хутчэй, а то можа адыйсці далёка.

— Адкуль ведаеш, што падазроная?

— Сэрцам чую; не падобна яна на нашых.

Праз некалькі мінут пяць пагранічнікаў ва чале з начальнікам і Нічыпарам галопам ляцелі па вузкаму прасёлку, што вёў ад заставы на вёску Дубягі. Нічыпар ехаў наперадзе. Пад ім гарцаваў вараны конь. Нічыпар разпо-разу аглядаўся назад, стараючыся ўбачыць, ці заўважаюць гэта пагранічнікі. Як толькі атрад наблізіўся да вёскі, начальнік звярнуў з дарогі і паехаў праз кусты. Праехаўшы некалькі метраў, ён спыніўся, злез з каня і паклікаў да сябе пагранічнікаў. Тыя падышлі, моўчкі гледзячы на свайго камандзіра.

— Тут, кажаш, звярнула яна з дарогі? — спытаўся начальнік у Нічыпара.

— Тут, тут. Вось на гэтым самым месцы. Па кусціку гэтаму бачу, — падаў Нічыпар, паказаўшы рукою на куст.

— Вось што, таварышы, — звярнуўся начальнік да пагранічнікаў, — загад мой вельмі просты: Шахаву і Дзёміну ісці кустамі да балота і, калі жанчыны не будзе, заняць там месца ў сакрэце. Аляксееву і Пахомаву ісці канавай, што на правы бок дарогі і, дайшоўшы да хутара, чакаць далейшых маіх загадаў. Лёскін застаецца тут, пры конях. Я пайду з дзядзькам Нічыпарам праз вёску Дубягі. Зразумела, таварышы?

— Ёсць, таварыш начальнік, — разам адказалі пагранічнікі.

— Як-жа ты сустрэўся з ёю? — звярнуўся начальнік да Нічыпара, калі яны ішлі да вёскі.

— Выйшаў я сёння ў поле збажыну паглядзець: брыгадзір-жа я, сам ведаеш. Абышоў увесь жытні палетак. Добрае жыта ў гэтым годзе: вялікае, колас буйны і ўжо налілося. Палюбаваўся гэта я і думаў пайсці на ярыну паглядзець. Іду і чую, што нехта прыгожа іграе. Паглядзеў я наўкруг і бачу, што сядзіць наш пастух Нупрэй. Пагаварыў я з Нупрэем і пайшоў далей. Толькі выйшаў на дарогу, аж бачу — нехта ідзе. Здалёку відаць, што незнаёмы чалавек, бо ідзе і азіраецца наўкругі. Я прыгледзіўся лепш і бачу, што ідзе жанчына. Як толькі яна параўнялася са мной, я, прывітаўшыся, спытаўся:

— Здалёку будзеце?

— Са станцыі, — кажа.

— Як бачу я, вы не з мясцовых? — пытаюся зноў.

— Я прыехала сюды на работу — адказвае.

— На работу? — пытаюся. — І далёка дзе будзеце працаваць?

— У Дубягінскай школе, — кажа.

— А дакументы маеце? — не адстаю я. Яна злосна кажа, што я не маю ніякага права патрабаваць дакументы.

— Я дзесяць разоў ужо паказвала,— дадае яна.

— І адзінаццаты раз пакажаце мне,— цвёрда стаю я на сваім.

Паглядзеўшы, што ўсе дакументы ў парадку, я адпусціў жанчыну. Яна пайшла далей, а ўсё азіраецца. Непакоіць мяне жанчына. Сэрцам чую, што не з нашых яна. Тут толькі ўспомніў я, што ў Дубягінскай школе і настаўнікі ўсе ёсць, сам учора там быў.

— Дык, кажаш, не з нашых яна? — спытаўся начальнік.

— Я ніяк не магу дараваць сабе, — хваляваўся Нічыпар, не зважаючы на словы начальніка. — Гэта-ж трэба дапусціць такую памылку!

— Што-ж, памылку трэба выпраўляць, — сказаў начальнік.

У вёску Дубягі жанчына і не паказвалася. Начальнік убачыў, што тут рабіць няма чаго, і аддаў загад выставіць дадатковыя пасты.

Надышла ноч. Ні шолесту, ні шуму, ні перастуку неўгамонных дзятлоў. Усё змоўкла раптоўна. Нават вецер не калыхаў больш хваль ракі, якая ўтулілася ў свае берагі і нібы думала над загадкай гэтай ночы.

... Усю ноч шукалі пагранічнікі таямнічую жанчыну. Аднак, тая прапала без следу. Здаецца, вядомы кожная сцежачка, кожны кусцік, а жанчыны— як не было.

Хваляваўся і начальнік заставы. Ён здагадаўся, што пад гэтай жанчынай хаваецца буйны дзяржаўны злачынец. Патрэбна было дзейнічаць неадкладна.

...Толькі пад раніцу ў габінет начальніка, які і не думаў лажыцца спаць, прывялі жанчыну. Яна стаяла перад ім і злосна аглядалася навакол, а потым, каб схаваць сваё хваляванне, начала скардзіцца на незаконнае затрыманне.

— Я пратэстую, — гаварыла яна, — вы гэтак усіх чэсных людзей затрымаць можаце.

— Не хвалюйцеся, грамадзянка, — у вашай чэснасці мы разбярэмся, — прамовіў начальнік заставы і прыступіў к допыту.

Павел ДУБОВІК.

Слуцк.

К. Е. ВАРАШЫЛАЎ. Партрэт работы мастака Я. М. Кругера.

ПЕСНЯ—НАША ЗБРОЯ

Самадзейнасць Чырвонай Арміі за апошні час мастацка значна вырасла, стала больш масавай, палітычна насычанай, тэматычна больш злобадзённай, яна пранікла ў нізавое армейскае звяно.

Асаблівай увагі заслугоўваюць ансамблі чырвонаармейскай песні і пляскі пад кіраваннем чырвонаармейцаў тт. Булавіна і Бялова. Рэпертуар гэтых калектываў — песні Чырвонасцяжнага ансамбля песні і пляскі, выконваемыя з вялікім густам і на высокім мастацкім узроўні. Змешаны хор пад кіраваннем тав. Грыгор'евай, хор пад кіраваннем тав. Разоўскай, хор і жаночы вакальны ансамбль пад кіраваннем тав. Дзегціярэнка выконваюць творы совецкіх кампазітараў, народныя рускія і украінскія песні, творы рускай класікі. Жаночы вакальны ансамбль пад кіраваннем тав. Сеўскага падрыхтаваў праграму з твораў класічнага рэпертуару.

Надзвычай цікавую з'яву прадстаўляе грузінскі этнаграфічны хор пад кіраваннем тав. Далідзе. Ансамбль па-майстэрску выконвае народныя грузінскія песні пра Леніна і Сталіна і ў радзе народных песень перадае цудоўныя напевы сонечнай Грузіі, суправаджаючы іх захапляючымі танцамі грузінскага народа.

Танцавальна-плясавае мастацтва, як неад'емны від чырвонаармейскай творчасці, яшчэ шырэй распаўсюджана ў часцях Чырвонай Арміі. Чырвонаармейская пляска, якая па сваёй прыродзе з'яўляецца комплексам народных танцаў з запейным ухілам, уяўляе вялікую цікавасць. Пляскі прасякнуты выдумкай, у іх шмат жвавасці і тэмпераменту, уласцівага байцу Чырвонай Арміі.

Вакальны жанр — яркае сведчанне растучай культуры сям'і камандзіра. Толькі ў вакальнай студыі Менскага Дома Чырвонай Арміі займаецца да 20 байцоў, камандзіраў і жонак камначскладу. Сольныя спевы сталі неабходнай састаўной часткай усёй чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. Сярод салістаў — спевакоў і спявачак—сустракаюцца таленавітыя і здольныя выканаўцы складанага сольнага вакалу.

Умацаваліся і выраслі музычныя калектывы чырвонаармейскіх клубаў. Самадзейны джаз-аркестр пад кіраваннем капельмайстра тав. Нахшына (склад — да 100 чал.) займае па якасці праграмы, стылю рэпертуару, актуальнасці выконваемых рэчаў у часцях БАВА вядучае месца, як узорны, адзначаны Ваенным советам БАВА калектыў. Змешаныя самадзейныя калектывы, кіруемыя ст. лейтэнантам тав. Шкурыным і інтэндантам 3-га ранга тав. Сеўскім, прадстаўляюць сабою вялікую каштоўнасць, як добра зладжаныя і сыграныя ансамблі.

Драматычныя калектывы клубаў часцей Чырвонай Арміі разгарнулі шырокую работу па стварэнню складаных спектакляў. Многія калектывы даказалі сваю мастацкую магутнасць радам выдатна падрыхтаваных пастановак: «Падзь Сярэбраная», «Вочная стаўка» бр. Тур і Шэйніна, «Разгром» Фадзеева, «Разлом» Лаўрэнёва. Рэпертуар рускіх класікаў—Астроўскага, Сухова-Кабыліна, Гогаля, замежных класікаў Мальера, Гальдоні і інш. ацэнен клубамі часцей і над ім ідзе сур'ёзная работа.

Песня, верш, спектакль і музыка сталі зброяй Чырвонай Арміі і побач з баявой вучобай і падрыхтоўкай чырвонаармейцаў да будучых баёў накіраваны на ўмацаванне баявой магутнасці радзімы. І—калі заўтра вайна, дык у бой з ворагам, у лінію баявых калон несакрушальнай Чырвонай Арміі стане, як грозная зброя, песня і верш.

Улад. МУРАТ.

***

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ У ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ БССР

Совецкі народ любіць сваю Чырвоную Армію. Таму і ў тэматыцы совецкіх мастакоў ваенны жывапіс займае пераважнае месца. Аб гэтым сведчыць і мастацкая выстаўка ў Маскве, якая была прысвечана XX-годдзю Чырвонай Арміі, і выстаўкі беларускіх мастакоў у Менску.

У работах беларускіх мастакоў найбольш шырока адлюстраваны тэмы грамадзянскай вайны і гераічнай барацьбы беларускага народа з белапольскімі акупантамі. Магілеўскі мастак К. Гедла напісаў карціну «Чырвоная конніца громіць белапалякаў». Мастак Е. Ціхановіч напісаў карціну «Орджанікідзе ў разведцы ў раёне гор. Барысава». Мастак Е. Зайцаў першую сваю вялікую карціну прысвяціў легендарнаму герою грамадзянскай вайны В. Чапаеву. На гэтую-ж тэму зрабіў карціну і мастак А. Забораў. Карціна «Апошні бой Чапаева» работы Е. Зайцава можа быць аднесена да ліку лепшых карцін аб Чырвонай Арміі, напісаных беларускімі мастакамі.

Карціна зроблена з вялікай пераканальнасцю, яна вучыць нас быць такімі-ж мужнымі і бясстрашнымі ў барацьбе з ворагамі рэволюцыі, якім быў Чапаеў.

Многа працавалі і працуюць беларускія мастакі над тэмай уваходу Чырвонай Арміі ў Менск. Вялікія палотны на гэту тэму напісаны віцебскім мастаком І. Ахрэмчыкам і менскім мастаком М. Манасзонам. У апошні час на гэту-ж тэму мастак Н. Гусеў напісаў трыпціх. На першай карціне трыпціха мы бачым наступленне Чырвонай Арміі раніцою 11 ліпеня. Белапалякі ў паніцы ўцякаюць, праследуемыя чырвонай конніцай і атакуючымі чырвонаармейскімі часцямі. На другой карціне мы бачым узброеных рабочых Менска, якія страляюць з засады па белапалякaх. Трэцяя карціна, завяршаючая тэму трыпціха, паказвае ўваход Чырвонай Арміі ў Менск і радасную сустрэчу чырвоных байцоў насельніцтвам вызваленага горада.

Але трыпціх работы Н. Гусева, як і памянёныя карціны І. Ахрэмчыка і М. Манасзона, можа быць аднесен да ліку толькі добрых спроб манументальнага жывапісу. Ахрэмчык і Манасзон вельмі многае хацелі сказаць сваімі карцінамі, у рэзультаце карціны атрымаліся сюжэтна пячоткімі, перагружанымі дзеючымі асобамі. Гусеў пазбегнуў гэтай перагружанасці, імкнучыся да больш простага і чоткага плана, але яму не ўдалося знайсці неабходнага вырашэння: кожную карціну ён пісаў як-бы ізаліравана ад другой і не здолеў аб'яднаць іх адзіным тэматычным замыслам. Нехапае Гусеву і тэхнічнай дасканаласці. У трыпціху шмат манатонных каляровых плям, вельмі слабы рысунак. Калі Ахрэмчык і Манасзон у той ці іншай меры стараліся заўважыць у дзеючых героях тыповае, уласцівае толькі совецкім людзям, дык у трыпціху Гусева па сутнасці няма тыпажу: вобразы герояў не прапрацаваныя, расплыўчатыя. Над гэтым трыпціхам Гусеву трэба яшчэ шмат працаваць.

Лепшая карціна аб чырвоных партызанах напісана В. Волкавым. Гэтай-жа тэме сваю самую буйную работу прысвяціў і мастак П. Гаўрыленка, паказаўшы на карціне партызанаў у засадзе, гатовых сустрэць кулямётным агнём набліжаючыхся па дарозе белапалякаў.

Чырвоная Армія сёнешняга дня, яе баявая і палітычная падрыхтоўка, яе быт таксама знаходзяць рознастайнае адлюстраванне ў беларускім жывапісу. Шмат працуе ў гэтым кірунку старэйшы беларускі мастак Я. Кругер. З буйных тэматычных твораў гэтага мастака назавем карціну «Чырвонаармейцы гуляюць у мяч». Кругер выязджаў у лагеры і напісаў гэту карціну з натуры, адлюстраваўшы на ёй квітнеючых здароўем, вясёлых чырвонаармейцаў у захапляючай фізкультурнай гульні. З партрэтных работ Кругера вылучаецца толькі-што закончаны ім вялікі партрэт наркома абароны К. Е. Варашылава.

Вылучаецца дынамічнасцю і зместам эскіз мастака М. Беляніцкага «Калгаснікі сустракаюць чырвоных коннікаў, што вяртаюцца з манеўраў».

Вялікая, пакуль-што падрыхтоўчая, работа па вялікай карціны аб чырвоным казацтве праероблена мастаком Н. Тарасікавым. З цыкла гэтых работ вылучаюцца эскіз «Артылерысты» і эцюды «На вадапоі», «Праз бар'ер», «У атаку». Ва ўсіх гэтых работах ёсць дынамічнасць і разуменне колеру, але, нажаль, у пагоні за каляровымі эфектамі Тарасікаў забывае аб галоўным: аб тыпажы герояў. Добры па колеру эскіз «Артылерысты» задуман некалькі фармалістычна: план нібы «перакулен», конныя казакі і артылерысты павернуты тварам у глыб карціны. Толькі па адных чырвоных башлыках гледачу прадастаўляецца магчымасць дужаць, што на карціне паказаны чырвоныя казакі і артылерысты.

У скульптуры Чырвоная Армія найбольш поўна прадстаўлена ў работах заслужанага дзеяча мастацтваў А. Бембеля. У помніку Леніну ў Полацку Бембель паказаў Леніна як арганізатара ўзброеных сіл рэволюцыі. Скульптар увёў у кампазіцыю помніка вялікі барэльеф на тэму аб барацьбе беларускага народа з белапалякамі і размясціў справа і злева ад фігуры Леніна скульптуры чырвонаармейца і матроса.

Зараз Бембель працуе над манументальным трохчастковым рэльефам для аванзалы беларускага павільёна на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Рэльеф гэты паказвае БССР як фарпост Совецкага Саюза на заходніх рубяжах. На фоне Крэмля Бембель разгарнуў скульптурную групу: танкіст, парашутысткі, лётчык, калгаснік і пагранічнік. Справа і злева ад групы паказана магутнасць ваеннай тэхнікі краіны социялізма: гарматы, самалёты і танкі. На адным з баковых рэльефаў паказаны манеўры: група сувязістаў, на другім — узброеныя фізкультурнікі. Як і ў большасці сваіх работ, А. Бембель выступае ў гэтым рэльефе як майстар кампазіцыі. Застаецца пажадаць, каб А. Бембель, адмовіўшыся ад уласцівага яго ранейшым работам схематызма, стварыў сапраўды манументальныя, гераічныя і цудоўныя вобразы людзей Совецкай Беларусі, што несакрушальнай сцяной стаяць на варце заходніх рубяжоў нашай социялістычнай радзімы.

Шмат працуюць над абароннай тэматыкай скульптары А. Глебаў і А. Орлоў. Глебавым выканана вялікая скульптурная група «Па следу ворага», паказваючая калгасніка і пагранічніка з сабакам, якія праследуюць парушальнікаў граніцы. Глебавым выканана таксама цікавая жанравая скульптура «Чырвонаармеец і калгасніца танцуюць «лявоніху». А. Орловым выканана манументальная група «На варце мірнай працы», якая паказвае трактарыста з вінтоўкай і калгасніцу з супроцьгазам, гатовых стаць на абарону радзімы. Зараз Орлоў працуе над скульптурнай кампазіцыяй «На граніцы» для беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Шырока адлюстравана Чырвоная Армія і ў работах беларускіх графікаў і дэкаратараў. З дэкарацыйных заслугоўваюць быць адзначанымі каштоўныя работы мастака Б. Малкіна, які аформіў два абаронныя спектаклі: «Партызаны» і «Падзь Сярэбраная».

Адзначаючы дасягненні беларускіх мастакоў у галіне адлюстравання ў жывапісу і скульптуры гераічных подвігаў Чырвонай Арміі, яе баявой вучобы і культурнага адпачынку, нельга не сказаць, што дасягненні гэтыя далёка яшчэ не адпавядаюць тым патрабаванням, якія совецкі народ прад'яўляе да абароннай тэматыкі ў мастацтве.

Новыя выдатныя творы пра Чырвоную Армію, пра гераічных пагранічнікаў павінны стварыць беларускія жывапісцы і скульптары, рыхтуючыся да мастацкай выстаўкі 1940 года «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Нашы мастакі павінны будуць паказаць у сваіх карцінах і скульптуры гераічны совецкі народ, яго Чырвоную Армію ў годы грамадзянскай вайны, у годы барацьбы з нямецкімі і белапольскімі акупантамі, паказаць кіруючую ролю ў гэтай барацьбе вялікіх правадыроў социялістычнай рэволюцыі таварышоў Леніна і Сталіна і іх слаўных саратнікаў тт. Калініна, Кагановіча, Орджанікідзе.

Работа над творамі для выстаўкі 1940 года будзе ў вялікай меры спрыяць далейшаму росквіту выяўленчага мастацтва Совецкай Беларусі, росквіту адной з важнейшых галін гэтага мастацтва — совецкага ваеннага жывапісу. Беларускія мастакі павінны імкнуцца да таго, каб жывапіс і скульптура на абаронныя тэмы былі выкананы з вялікім майстэрствам, каб гэтыя мастацкія творы беларускіх жывапісцаў і скульптараў побач з танкамі, самалётамі і гарматамі маглі ўвайсці ў залаты фонд абароны нашай цудоўнай социялістычнай радзімы!

А. ДАЛІН.

ПОМСТА

НА захадзе ўскрай неба купаўся ў пажары. Па-соннаму каля зарослай крыніцы піскнула нейкая птушка. Ахутаная туманамі, з бязмежнай вышыні яснага неба на зямлю апускалася парная ноч.

Абуты ў непамерна вялікія боты, я з цяжкасцю прабіраўся да паселішча. За маімі плячыма была стрэльба, а ў сетцы, прывязанай да пояса, — дзве качкі—здабытак сёнешняга палявання.

Раптам далёка на поплаве я заўважыў невялікі хісткі агеньчык. Цёплы ветрык даносіў ледзь чутныя словы.

— Гняды, каб цябе! От-жа не ўстоіш!..

Нейкую шчырую цеплыню чуў я ў гэтых буркліўых словах... Агеньчык усё набліжаўся і, нарэшце, пачулася фырканне коней. Я падышоў да агня. Каля яго быў сівы дзядок з круглым тварам, з глыбокімі, шэрымі вачыма.

На прывітанне дзед не адказаў. Моўчкі агледзеў мяне з ног да галавы. Выняў з кішэні берасцяную табакерку і набіў люльку, але перадумаў і запхнуў яе ў кішэню. Рухі яго паважныя, як паважны і яго твар — удумлівы і крыху спахмурнелы.

— Адкуль будзеш? — раптам спытаўся ён.

— Прыезджы, — адказаў я, адчэпліваючы з пояса сетку з забітымі качкамі. — А жыву тут у дзядзькі.

— У дзядзькі?

— Але. У Баравой.

— Усіх там ведаю...

— У Васіля Сініцы.

— Дык ты яго пляменнік! А братачка, то сядай, адпачні. Змарыўся? А я думаў — што за такі?

У старога адразу развязаўся язык.

— То-ж мы колісь з тваім дзядзькам, Васілём гэтым самым — ого! — палякаў лупцавалі. Ды яшчэ як! Мы ім, саколе, даліся ў знакі!

Хісталася полымя, трашчэла сухое ламачча і залацістыя пырскі падымаліся разам з сівым дымам у паветра.

— А як-жа, ведаю твайго дзядзьку.

Я моўчкі скінуў стрэльбу і лёг на шаўковы дыван зямлі. Адчуў цяжкую стому. Я выняў папяросу і прыкурыў ад вугалька. Дым некалькі праганяе сон. Пэўна ў той крыніцы, паўз якую я ішоў, хрыпата басілі дзікія селязні.

— Дык і вы ў дзядзькавым атрадзе былі?

— А як-жа, быў! Тут амаль усе мужыкі, што, значыць, пабядней, у лясы ішлі.

Я прагна курыў.

— Жыццё, яно — што вада. Бяжыць і ўсё спяшаецца. О, каб мне зараз тыя годы! А было, здаецца ўчора... Я, значыць, жыў у вёсцы невялічкай. Пяскі —звалася... Ну, якраз палякі наляцелі — раніцою справа была. Пачалі патрашыць пасялян. Усё забіралі. І птушку, якая была, і авечак, і свіней. На вуліцы пух лётаў — падушкі распорвалі і нейкай там зброі шукалі. А Кавальчук Андрон карову ў свінушнік захаваў. А ў свінушніку люстра стаяла. Вялікае, — з панскага фальварка яго прыцёг. І на якое ліха здалося яму тое люстра! Каб не яно, усё добра абышлося-б. Бач, карова ў люстры не разгадае сябе... разагналася ды і трахнула яго рагамі. Разляцелася яно на кавалкі. А палякі ў двары былі, пачулі бразгат. Узламалі ў свінушніку дзверы, люстра пазналі, — што панскае, значыць. Кавальчука і сына ў камендатуру пагналі, а назаўтра іх расстралялі. Сын малады быў — год шаснаццаць... Э-э, было... Стралялі малых і старых. Кавальчуковых у нізіну звезлі, не закапалі нават...

Захад згасаў; шэрая дымчатая плёнка засцілала небасхіл. А на поплаве фыркалі коні і тонка іржала жарабё, адшукваючы ў цемры сваю маці.

— А да мяне ў хату жаўнеры прышлі — чалавек пяць. А сярод іх, значыць, паручык — сыты, і бруха ў яго нібы мяч... Лапочуць нешта па-свойму. Толькі я вуха навайстрыў, зразумеў, што ў сваты ехаць некуды збіраюцца. «Лайдак, пся-крэў!» — крычыць на мяне паручык. Прызнацца, спалохаўся я. «Няўжо, думаю, дазнаўся?». А я, ведаеш, два чыгуны з фальварка прынёс. На кухні ўзяў, калі пана прагналі. «Запрагай каня!» Ну, я што. Пярэчыць нельга, бо заб'юць. Каня запрагаю ў двары, а сам галаву павесіў. Бачыш, белякі гэтыя так рабілі: павязеш іх, а яны і прыстрэляць цябе на дарозе...

Развітаўся я з жонкаю. Выехалі з двара, калі змяркацца пачалося. «Куды, пытаюся, ехаць?» — У фальварак! — крычыць паручык. «Эге, думаю, пан, значыць, прыехаў». І тады ўспомніў я, што ў пана дачка была, маладая гэткая і гонкая, што жэрдка. А вечар той быў цёмны, за два крокі нічога не відаць. Едзем. «Паганяй хутчэй!» — крычаць яны на мяне. А жывёліна мая шустрая была, пужкай сцебану — імчыць, што страла.

Паганяю я яе, а самога думы цяжкія грызуць. Вязу я, значыць, самую што ні ёсць поганць. І вязу ў сваты да самага майго ворага — пана. Я яму, сукінаму сыну, яшчэ ў пачатку гэтай завірухі морду набіў. Пападзіся зараз да яго — смерці не мінаваць... А ў брычцы сядзіць белякі, п'яныя ў дрызіну, і рагочуць, як чэрці, аж рэха ідзе. Паручык-жа, — малады, значыць, — песню завёў, пра жанчын. Ліха яго ведае, дзе ён яе выкапаў, толькі слухаць брыдка. Злосць мяне разабрала. Эх, не здагадаўся я тады сякеру пад пінжаком схаваць. Паразбіваў-бы ім галовы!

Полымя лізнула языком паветра і патухла. Угору паплыў густы, чорны дым. Дзед на гарачае вугольле накідаў галля і разадзьмуў агонь. На яго твары была задуменнасць. Ён з хвіліну памаўчаў, потым выняў люльку і закурыў.

А ў крыніцы ўсё крычалі качкі. Калі-ні-калі, напорыста зазыкаючы ў паветры крыллямі, яны пралятаў над намі. Яшчэ іржала на поплаве ўстурбаванае жарабё.

— Ну, а вёска наша — Пяскі, значыць, — непадалёк ад рэчкі Бярозы стаяла. Ты быў у тым месцы калі-небудзь? Не? Шкада. Цікавае месца! Дарога да фальварка паўз самы бераг ідзе. А бераг круты-круты! І высокі. Глянеш уніз — страх бярэ. Еду я ды думаю — што рабіць? Усёадно ў прасак пападзеш. Усёадно гінуць. І тут мне раптам думка прышла: «А што, калі пусціць з берага ўсю гэту банду? П'яныя яны, пэўна не здагадаюцца пра мой намер... Еду гэтак паўз бераг, думаю ды каня стрымліваю лейцамі. «Паганяй!» — крычаць яны мне. — «Конь стаміўся» — адказваю.

У цёмна-сінім небе мігалі зоры. Было ціха. Толькі далёка-далёка выў воўк. Выў доўга, працяжна. Храплі коні...

— І жаль мне стала жывёліны. Прападзе, значыць, ні за што. Што-ж, конь той людзям дрэннага не зрабіў, а тыя, каго я вёз, жывёлы не каштавалі...

Пад'ехалі да ўзлеска, там дарога ўбок ад рэчкі вяла. «Скарыстоўвай, Яўхім, момант, пакуль не позна» — думаю.

А ў брычцы палякі лаюцца, — паміж сабой, значыць. Толькі паручык усё гэту паскудную песню мурлыча.

Запыніў я каня, а ў самога сэрца вось-вось з грудзей выскачыць. І голас, прызнацца, змяніўся. Што-ж, жыццё пад самую што ні на ёсць пагрозу ставіў.

— Чаго спыніўся, пся-крэў?

— Лейцы адвязаліся! Я зараз.

— Ну, то хутчэй, лайдак! Ды ўцякаць не ўздумай — прыстрэлім!

— Пане паручык, — сказаў нейкі жаўнер, — а вам, пэўна, ложак прыгатавалі...

У баку, каля лесу, змоўкла выццё воўка. Дзесьці далёка ў вёсцы крычалі пеўні.

—...Злез я з брычкі, каня шагам пусціў, ды думаю: «Я ўжо вас ажаню, толькі-б удалося, значыць». Раблю выгляд, быццам лейцы прывязваю. А ў брычцы жаўнер, як не лопне, крычыць: «хутчэй там корпайся, такі-сякі!» Я каня ўсё больш к стромкаму берагу вярну. Толькі не такі быў той конь! Чуў ён, значыць, небяспеку і ўпіраўся, ісці не хацеў. Каня таго я з малых год узрасціў. Прывязаўся ён ка мне і па голасу далёка-далёка пазнаваў. Бывала, іду куды і ён за мной бяжыць, а адганяць яго... неяк жаласна станавілася. І да таго мне каня шкада стала, што слёзы на вочы набеглі. «Мішка, — шапчу, — Мішанька. Коська мой дарагі».

І — дзіўна, пачуў конь мой ласкавы голас, пайшоў. А каля самага берага адскочыў я ў бок, моцна выцяў па крупу каня пугай. Як свяча, узвіўся конь, іррануўся ўперад і... Эх, хлапчына, што тады са мной было! Заплакаў я. Не па тых, вядома, што ў брычцы былі. Па кані... Бо чуў, як заіржаў ён тонка, быццам са мною развітваўся. Чуў яшчэ, як абарвалася брыдкая паручыкава песня і як змянілася яна на благі роў... Пасля шлёпнулася брычка з канём маім і жаўнерамі ў ваду... Толькі лес шумеў. Сумна шумеў лес. Вось і пайшоў я туды хавацца.

Дзед змоўкнуў. Але потым на яго спахмурнелым твары паявілася вясёлая ўсмешка.

— А зараз, бач, колькі коней... І добрыя коні!

Над зямлёй слаўся ранішні туман. Іржала жарабё. Дзед раптоўна прыўзняўся і прыслухаўся.

— Э-э, хлапчына, — сказаў ён. — Загаварыўся я з табою. А жарабё, пэўна, даўно маці шукае. Трэба дапамагчы яму.

Ён падняўся, — сівы, але каржакаваты. Перакінуўшы пугу праз плячо, знікнуў у цемры. А праз некаторы час пачуўся прыемны густы дзедаў голас:

— Лапечка, чаго-ж ты бегаеш, дурненькі?..

Я падумаў: як любіць дзед калгасны табун...

З трэскам гарэў агонь. Спрабавала брацца на золак.

МІКОЛА ЛУПСЯКОЎ.

СЕРГО ОРДЖАНІКІДЗЕ У РАЗВЕДЦЫ ПАД г. БАРЫСАВАМ
Карціна мастака Е. Ціхановіча.

МЕНДЛ ЛІУШЫЦ

ПАМЯЦІ СЕРГО ОРДЖАНІКІДЗЕ

(Да другой гадавіны з дня смерці)

Холад, вецер, снежны дол,
Белы воблак, чорны боль.
Хутка ранак прыдзе чысты,
Расцвіце на дрэвах лісце.
А зямля такой парой
Будзе цешыцца вясной.

Што-ж мяне так прыгнятае,
Боль глухі, туга намая?
Прыдзе светлы май, вясна,
А Серго між нас няма.
Не пабачыць ён нябёсы,
На зялёных травах росы.

Як шапне на дрэве ліст,—
Полем пойдзе трактарыст,
Жнівеньскім, высокім раннем
Прыдзе на палі камбайнер.

Тут, Серго, сыны твае, —
З імі разам ты ўстаеш.

Каб спакойна нам жылося, —
Самалёт ляціць у просінь,
Стаў армеец у дазор,
Пад зямлёй ідзе шахцёр.
Мужнасць бессмяротна ў людзях,
З намі жыць, Серго, ты будзеш.

Хоць суняць і не магу
Я глыбокую тугу,
Але ўцеху ў свеце маю —
Край совецкі расцвітае.
Я жыццё за шчасце краю,
Як Серго, аддаць жадаю.

Пераклад з яўрэйскай мовы
ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ.

ВЫСТАЎКА ЧЫРВОНААРМЕЙСКАГА ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

23 лютага ў Смаленску, у акруговым Доме Чырвонай Арміі імя М. В. Фрунзе адкрываецца акруговая выстаўка чырвонаармейскага самадзейнага выяўленчага мастацтва. Менскі Дом Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава накіраваў на выстаўку 110 экспанатаў. Сярод іх — 25 работ чырвонаармейца тав. Палянычка: партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, камандзіраў і таварышоў на службе; тры скульптуры малодшага камандзіра тав. Трафімава: «Бюст таварыша», «Палітрук», і «Танцуючая дзяўчына», а таксама рад карцін, рысункаў і разьбы па дрэву іншых аўтароў.

КАНЦЭРТЫ ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Менскі Дом Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава ў гонар XXI гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота правёў рад выступленняў чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці праз радыёстанцыю імя Соўнаркома БССР. У канцэртах прынялі ўдзел лепшыя калектывы самадзейнасці і індывідуальныя выканаўцы. Заключны канцэрт па радыё, прысвечаны XXI гадавіне Чырвонай Арміі, адбудзецца 24 лютага.

ДВА КІНО-ФЕСТЫВАЛІ АБАРОННЫХ ФІЛЬМАЎ

З 11 па 16 лютага ў Менскім Доме Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава і ў награнатрадзе праведзены ў парадку шэфства работнікаў мастацтваў над Чырвонай Арміяй два кіно-фестывалі абаронных фільмаў. Перад шматлікай аудыторыяй байцоў, камандзіраў і членаў іх сямей былі прадэманстраваны лепшыя совецкія абаронныя фільмы — «Мы з Кранштадта», «На граніцы», «Калі заўтра вайна» і трылогія аб бальшавіку Максіму: «Юнацтва Максіма», «Зварот Максіма» і «Выбаргская старана».

Пасля прагляду кожнага фільма наладжвалася абмеркаванне яго, у якім актыўны ўдзел прымалі кінорэжысёр ордэнаносец Дзіган і кіноартыстка Есіпенка.

У сваіх выступленнях тав. Дзіган прасіў удзельнікаў грамадзянскай вайны падзяліцца ўспамінамі аб Першай коннай арміі, фільм аб якой ён зараз ставіць. Па ўспамінах камандзіраў Чырвонай Арміі тав. Дзіган сабраў шмат цікавага матэрыялу аб Першай коннай.

Кіно-фестывалі прайшлі з вялікім поспехам. Залы, дзе дэманстраваліся фільмы, былі перапоўнены. У фае былі арганізаваны фота-вітрыны аб абаронных фільмах, гледачы былі забяспечаны праграмамі, лібрэта і іншымі матэрыяламі.

ОРДЭН № 1528

1918 год. Екацярынаслаў. Па гораду гуляюць махноўцы. Стогнамі поўняцца вуліцы — грабяжы, гвалты, здзекі. Днепр нясе на сваіх хвалях мёртвыя целы яўрэяў, скінутых з моста... У паветры лётае пух з распаротых падушак. Палаюць рабочыя ўскраіны.

Стары паравозік падцягвае да вакзала аблупленыя вагоны. З вагонаў выскакваюць маладыя, яшчэ не абстраляныя, байцы Чырвонай Арміі.

— Стройся!—падае каманду камандзір роты комуніст Оцякшэў. Прама з вакзала хлынула агнявая нястрымная лава, — адкаціліся, разбегліся махноўцы. З чэсцю вытрымалі ў гэты дзень сваё першае баявое хрышчэнне малады баец Емельян Кудраўцаў і яго таварышы.

Узрастаў Емельян Кудраўцаў, як гарох пры бітай дарозе: хто не ідзе—ушчыпне. Шмат год гнуў спіну на кулака Агапкіна, накапліваў сілы, і вось зараз, сціснуўшы дужымі мазолістымі рукамі баявую падругу-вінтоўку ўногу са сваімі таварышамі ён выйшаў абараняць родную Совецкую ўладу, заваёўваць чалавечыя правы. Як радавалася сэрца Емельяна першай перамозе над ворагам! З якой глыбокай нянавісцю ўсаджваў ён свой штых у грудзі ворага.

Па сёлах і гарадах, па дарогах і без дарог кацілася магутная лава чырвонаармейцаў да Юзаўкі, насустрач бандам генерала Май-Маеўскага. Не стрымаў вораг магутнага напору — адкаціўся. Вось і Вазнясенскі руднік. Рота чырвонаармейцаў у заставе. З дзікім крыкам урываецца на руднік банда Шкуро, бліскаюць саблі, уздыбліваюцца коні, воўчыя хвасты на папахах развяваюцца па ветру.

— Уперад, бі гадаў! — закрычаў з тачанкі камандзір палка і сцебануў шкуроўцаў кулямётнай чаргой. Разам з таварышамі рынуўся Кудраўцаў на бандытаў. Пакрылася пылам поле бою і калі пыл развеяўся — зачырванела зямля крывёю паўшых, а дзесьці далёка развяваліся воўчыя хвасты на папахах уцякаўшых шкуроўцаў.

Напоўгаладных і абадраных, знясіленых няроўнай барацьбой чырвонаармейцаў касіў тыф. Зваліў ён з ног і чырвонаармейца Емельяна Кудраўцава. Не раз, лежачы на шпітальным ложку, адчуваў Кудраўцаў набліжэнне смерці, але моцны арганізм яго, загартаваны ў баях з ворагамі, перамог хваробу і Емельян зноў стаў у строй побач са сваім старэйшым братам Мітрафанам.

Насядаюць узброеныя да зубоў воўчыя дывізіі Шкуро на амаль бяззбройныя часці Чырвонай Арміі. Вось яны падышлі да станцыі Аляксееўскай. Мост! Трэба ўзарваць мост, каб спыніць наступ ворага, — вырашае камандаванне. Кудраўцаў і двое таварышоў паўзуць пад агнём варожых кулямётаў. Шкада маста, будаваць новы давядзецца, але іншага выхаду няма. Шэры дымок хутка пабег па бікфордаваму шнуру, грымнуў выбух, узляцелі ўгору шчэпкі, змяшаныя з зямлёй. Адкінула Кудраўцава, ударыла аб зямлю. Губляючы свядомасць, ён заўважыў—мост знік, а, значыць і наступ ворага спынен.

Ніколі не забыць Кудраўцаву боя пад станіцай Цімашэўскай... Полк на світанні ішоў у наступленне. Белыя заселі за высокім насыпам. Кудраўцаў ляжаў ля кулямёта, падтрымліваючы агнём наступаючых.

— Падавіць кулямёт супраціўніка ў кустах! — загадаў камісар. Тры разы мушка кулямёта лавіла кусты, тры чаргі свінцовага граду прасвісталі ў паветры: варожы кулямёт змоўкнуў.

— Што, атрымалі гасцінец?—запёкшыміся губамі шэпча Кудраўцаў і зноў прыпадае да кулямёта. Раптам поблізу тачанкі луснуў снарад. Узняўся слуп зямлі, правішчэлі над галавой асколкі, зваліўся на зямлю мёртвы яздовы.

— Ух, сволачы!—заскрыгатаў зубамі Кудраўцаў, змяціўся, лінуў свінцовым лівенем па варожых часцях.

Другі снарад разарваўся побач. Кудраўцава падкінула ўгору, перад вачыма паплылі кругі, у вушах зашумела і ў забыцці ён пачуў каманду камандзіра палка тав. Еўтушэнка:— За мной, у атаку! «Наша возьме», — мільгнула ў галаве, і Кудраўцаў страціў прытомнасць. Параненага, скрываўленага, знайшлі яго таварышы, вярнулі да жыцця. І зноў ён біўся з ворагамі за родную зямлю.

Валнаваха і Крым, Тбілісі і Батумі радасна сустракалі Чырвоную Армію, з вялікай любоўю віншавалі чырвонаармейцаў з перамогай над ворагамі,— і вялікай радасцю і шчасцем было перапоўнена сэрца чэснага і адданага совецкай радзіме байца-кулямётчыка Емельяна Кудраўцава.

У Батумскім гарадскім садзе хавалі паўшых герояў. Плячо ў плячо, сурова насупіўшы бровы, стаялі над свежай магілай байцы. Схіляліся ўвітыя крэпам баявыя, прабітыя кулямі, сцягі. Аб баявым шляху думалі ва ўрачыстым маўчанні байцы і камандзіры, аб баях мінулых і будучых. Моўчкі стаяў і Емельян Кудраўцаў. У яго сэрцы незгасальным агнём гарэла нянавісць, свяшчэнная нянавісць да ворагаў, ператвораная ў баявыя справы на франтах грамадзянскай вайны. За гэтыя справы ордэнам Чырвонага Сцяга ўзнагародзіла Кудраўцава радзіма.

Ордэн № 1528 і медаль «XX год РСЧА» гараць агнём мужнасці і славы на грудзях батальённага камісара Емельяна Цітавіча Кудраўцава, вернага сына партыі Леніна—Сталіна, былога адважнага чырвонаармейца-кулямётчыка.

С. ХАДЫКА.

УВАХОД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ У г. МЕНСК
Карціна мастака Н. І. Гусева. Фота І. Каплінскага.

ЭДУАРД БАГРЫЦКІ

(Да 5-годдзя з дня смерці)

Но песня не согласна ждать...
Э. Багрыцкі.

У Багрыцкага ёсць паэма «Трактир». У ёй адзінокі натхнёны паэт, які жыве на мансардзе, процінастаўлен сытаму і самазадаволенаму шынкару. Асноўная мысль паэмы — у гэтым супроцьстаўленні паэзіі, адасобленай ад шэрай і дакучлівай прозы жыцця, і самога жыцця, якое знаходзіцца ў канфлікце з паэзіяй. Увесь пачатковы перыяд творчасці Эд. Багрыцкага прайшоў пад знакам гэтага супроцьстаўлення.

Багрыцкі нарадзіўся ў Одэсе, ва ўдушлівым і затхлым свеце шынкара, дзе «все навыворот, все как не надо». У вершах гэты свет знікаў. У іх плавалі казачныя маракі на казачных фрэгатах, лятучы галандзец імчаў на ўсіх парусах, і людзі з прыгожымі імёнамі распявалі бесшабашную песню... Гэта

была паэзія. Добрая палавіна вершаў «Юго-Запада» адзначана рамантычным бунтам паэта супроць мяшчанства, мяшчанскай сытасці, мяшчанскага дабрабыту.

Перачытваючы аўтабіяграфію В. Маякоўскага, можна сутыкнуцца з нечаканым, вельмі здзіўляючым месцам: свае шматлікія падарожжы па Совецкаму Саюзу з чытаннем вершаў Маякоўскі вызначае, як працяг «прерванной традиции трубадуров и менестрелей». З тым-жа поўным правам мог сябе назваць прадаўжальнікам традыцый трубадураў і менестрэлей і другі буйны совецкі паэт, імя якога мы называем следам за імем Маякоўскага — Эдуард Багрыцкі.

Кожным крокам сваёй біяграфіі, кожным радком сваіх вершаў Багрыцкі адстойваў паэзію, адваёўваў яе ў старога свету, сцвярджаў разуменне паэзіі як з'явы жыццёвага неабходнага значэння. Можна сказаць, што Багрыцкі прышоў к соцыялізму ад мыслі аб несумяшчальнасці высокага паэтычнага мастацтва з самай бесчалавечнай і антыпаэтычнай прыродай уласніцкага свету. Багрыцкі ішоў к соцыялізму з усведамленнем таго, што толькі ва ўмовах соцыялістычнага грамадства прадастаўляецца шырокая магчымасць развіцця паэзіі.

Велізарная перамога Багрыцкага, якой ён дасягнуў у рэзультаце пройдзенага ім ідэйна-творчага шляху, заключаецца ў тым, што ён набыў погляд на паэзію, як на дзейсную зброю класавай барацьбы. Захаваўшы ў сабе ўсю першапачатковую свежасць і праэрыстасць успрыняцця свету, Багрыцкі змог спалучыць яе з працоўным і актыўным поглядам на свет. Вядомыя радкі Маякоўскага: «и песня и стих — это бомба и знамя, и голос певца подымает класс, и тот, кто сегодня поет не с нами, — тот против нас», — былі паэтычнай праграмай і для Багрыцкага. «Дума про Опанаса» і ёсць своеасаблівая варыяцыя на тэму: «тот, кто сегодня поет не с нами, тот против нас:..». Селянін Апанас ператварыўся ў сляпую зброю варожых сіл толькі таму, што ён хацеў стаць у баку ад схваткі, не хацеў «махать винтовкой» у перыяд жорсткіх класавых баёў. «Дума про Опанаса» — адзін з першых паэтычных твораў Эдуарда Багрыцкага, у якім тэма рэволюцыі прысутнічае па-за ўсякімі паэтычнымі псеўдонімамі ў сваім канкрэтным і рэалістычным увасабленні. Сапраўдная народнасць гэтай рэчы, яе яркая і красачная рамантычнасць, здзіўляючая лірычнасць у перадачы гераічнай тэмы, — усе гэтыя ўласцівасці «Думы про Опанаса» прынеслі паэме шырокую вядомасць сярод чытацкіх мас нашай краіны.

Сёння, у дні падрыхтоўкі да юбілея вялікага ўкраінскага кабзара Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка, мы з захапленнем перачытваем паэтычныя радкі «Думы про Опанаса», напісаныя пад непасрэдным плённым уплывам паэзіі Шэўчэнка. Прыемна ведаць, што адно з лепшых і красачных тварэнняў совецкай паэзіі сагрэта гарачым дыханнем вялікага народнага паэта мінулага.

Багрыцкі дасканала ведаў паэзію мінулага. «Ён пранёс, як носяць птушак за пазухай, усё лепшае, што было ў сусветнай паэзіі» (К. Паустоўскі). Кватэра Багрыцкага ператваралася ледзь не ў літаратурны універсітэт, куды маладыя паэты заўсёды прыходзілі вучыцца вясёламу і цяжкаму рамяслу паэзіі. У пакоі было поўцёмна ад акварыумаў. Рыбы плавалі ў зялёнай вадзе, і гэта было апошняе жыццё, якое праходзіла перад вачыма хворага і прыкаванага да пакоя чалавека.

Багрыцкі чытаў маладым паэтам вершы Дзержавіна, Пушкіна, Блока, Маякоўскага, Шэўчэнка, Случэўскага, Давыдава, Дэльвіга. Ён адкрываў новых паэтаў і прымушаў па-новаму гучаць старыя, здавалася-б, вядомыя радкі. Аб Багрыцкім можна сказаць, што ён быў рыцарам паэзіі ў лепшым і благароднейшым сэнсе гэтага слова. Са зброяй у руках змагаючыся на франтах грамадзянскай вайны, працуючы ў чырвонаармейскай газеце, Багрыцкі адначасова адваёўваў паэзію, помсціў за Пушкіна, які быў забіт светам шынкара, адплачваў усім тым, хто тысячагоддзямі рабіў злачынствы супроць песні.

Грандыёзныя перамогі соцыялізма ў нашай краіне, ліквідацыя самага зверскага і агрубелага эксплаататарскага класа — кулацтва, клопаты партыі аб інтэлігенцыі, — усе гэтыя моманты накіравалі ідэйнае і творчае развіццё Эдуарда Багрыцкага. У вершы «Т. Б. Ц.» хвораму, знемагаючаму ад раздум'яў паэту з'яўляецца Фелікс Дзержынскі і працягнутай уперад рукой адкрывае новыя невядомыя прасторы вясёлага вялікага века. Вядома, гэта ўжо не тая сумная, непрыемная проза жыцця, ад якой закрываліся паэзіяй. Наадварот, сама рэальная рэчаіснасць пераасэнсавана як невычарпальная крыніца паэтычнага натхнення, крыніца ваяўнічай і працоўнай рамантыкі. З адзінокай сваёй мансарды, упрыгожанай і расквечанай на чужы лад, песня апускаецца на зямлю жывой і рэальнай штодзённасці.

Возникает песня
В болтовне ребят,
Подымаэт песню
На голос отряд.
И выходит песня
С топотом шагов
В мир, открытый настежь
Бешенству ветров.

Г. БЯРОЗКІН.

Поўны збор твораў А. Н. Радзішчэва

У інстытуце літаратуры Акадэміі навук СССР вядзецца вялікая работа па выданню поўнага акадэмічнага збору твораў А. Н. Радзішчэва. У трох томах будзе сабрана ўсё напісанае ім. Першы том ужо выйшаў з друку, два другія выйдуць на працягу гэтага года.

АРТЫСТ, ВЫХАВАНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ

Адыходзіў суровы дзевятнаццаты год. Яго змяняў надыходзячы ў рашучых баях з ворагам дваццаты, які клікаў да канчатковай расплаты з азвярэлымі белапольскімі акупантамі.

Чырвоныя байцы, якія прагна чытаюць «Правду» і «Бедноту», прамовы Леніна і Сталіна. Чырвоныя байцы на поўгаладным пайку, у дзіравых ботах, без цёплай вопраткі, але ўпэўненыя ў сваёй праўдзе і высока ставячыя сілу зброі маладой Чырвонай Арміі. Гэта— фронт.

У гэты перыяд жывое мастацкае слова, музыка, агітплакат, лубок «Пятрушка», мастацкая пастаноўка, класічны і народны рэпертуар вакальнага мастацтва былі пастаўлены на службу Чырвонай Арміі, на дапамогу ёй для атрымання перамогі.

Разгарнулі сваю работу на фронце, у тылу, у пунктах сканцэнтравання войск агітацыйна-мастацкія брыгады, трупы-перасоўкі, палявыя тэатры. Паявіліся дывізійныя і армейскія стацыянары. Лепшыя, свядомыя, адданыя рэволюцыі людзі з тэатральна-эстраднага свету пакінулі свае пасады ў тэатрах сталіцы, буйных гарадоў і пайшлі на фронт. Побач з байцамі пераносячы цяжкасці паходнага жыцця, яны стваралі на імправізіраваных сцэнах — у абстаноўцы поля, вясковага гумна ці гарадскога клуба — яркія вобразы горкаўскіх, чэхаўскіх, ібсенаўскіх герояў, вобразы персанажаў Астроўскага і узнасім новыя для іх вобразы рэволюцыянераў з нарадаіўшайся новай, совецкай драматургіі. Закончыўшы спектакль, актвры бралі вінтоўкі і разам з байцамі білі ворагаў.

Так узнікла моцная дружба совецкага актора-байца з байцом Чырвонай Арміі, дабіваючым ворага пад Варшавай, на Перакопе, у астраханскіх стэпах, у далёкай Сібіры.

У ліку выдатных таварышоў з акторскага асяроддзя, аддаўшых свае здольнасці і майстэрства на баявую службу рэволюцыі, на барацьбу з інтэрвентамі, стаўшых у рады Чырвонай Арміі, запамінаецца Владзімір Осіпавіч Владамірскі.

1919 год. Фронт 16-й Чырвонай Арміі. Участкі 8-й і 17-й стралковых дывізій. Вёскі і мястэчкі ўздоўж ракі Бярозы. Тут зарадзіўся 2-гі Паказальны тэатр Чырвонай Арміі, які пасля заняцця Чырвонай Арміяй горада Бабруйска заснаваў у ім сваю базу.

Успамінаецца актор гэтага слаўнага тэатра — малады, рухавы бландзін, у шэрай студэнцкай куртцы, з заліхвацка зачасанымі валасамі. Жвавасць і рухавасць вылучалі яго з агульнага асяроддзя, да таго-ж ён быў вельмі дасціпным і дастаўляў сваім субяседнікам велізарнае здавальненне, выклікаючы ў іх самы шчыры смех.

Аднойчы ішоў спектакль у распалажэнні кавалерыстаў. Актор Владамірскі, скончыўшы сваю ролю, быў ужо сярод байцоў. Скінуўшы студэнцкі пінжак, ён паказваў байцам-коннікам майстэрства джыгітоўкі, даючы да «нажніц» чыста акрабатычныя нумары. Байцы глядзелі і дзівіліся: «Ўш ты, актор, а ездзіць не горш за нас».

Ідзе спектакль у стацыянары 2-га Паказальнага тэатра ў Бабруйску, на Шасейнай вуліцы. У тэатры байцы, прыбыўшыя з фронта. Тэатр паказвае «Баявыя сокалы» Пісемскага. Уваскрасае стары, прагніўшы свет. Ханжаства і блуд. Карціны абураюць сэрцы і пачуцці, глядач пасылае гэтаму пераджытаму і выгнанаму праклянці. Запамінаецца тып Цаплінава, панскага падхаліма, помстліўца за знявагу яго нізкіх пачуццяў, выкінутага з грамадства чалавечка. Роля Цаплінава В. О. Владамірскім была зроблена майстэрскі. Мінула 19 год, а нельга забыць вобраза напоўсагнутага, хітрага інтрыгана Цаплінава.

Другі спектакль — «Вольніца» Скітальца. Спектакль, у якім паказана нястрымная вольніца-моладзь, якая рвецца да святла, любві і свабоды. Жыццё кіпіць крыніцай. Захапляе сваёй весялосцю, нястомнасцю і энергіяй, якія б'юць крыніцай, Сашка ў выкананні Владамірскага. Вобраз надоўга, на многія годы застаецца ў памяці.

Творчы шлях армейскага тэатра і актора Владамірскага — гэта ўзор таго, як трэба працаваць, аддаючы здольнасці і творчую страсць мастацтву для барацьбы за дыктатуру пролетарыята, за соцыялізм. Творчы шлях народнага артыста БССР В. О. Владамірскага — паказальная школа для кожнага маладога актора, навучанне таму, як трэба спалучаць вырошчванне ў сабе таленту з непасрэдным удзелам у баях супроць ворагаў радзімы, і прыклад таго, як Чырвоная Армія вырошчвае са свайго асяроддзя таленавітых людзей.

В. О. Владамірскі заставаўся армейскім акторам да апошніх дзён існавання тэатра. 1921 год — сотні спектакляў у стацыянары, выязныя спектаклі. Яшчэ год — і армейскія тэатры ліквідыраваны. Пачынаецца шлях непатрабавальнага, скромнага, але таленавітага актора ў Дзяржаўным Беларускім драматычным тэатры.

1922 год. Цесная канурка на ўскраіне Менска, напоўгалоднае жыццё і інш. Была магчымасць пакінуць тэатр і пайсці на другую, матэрыяльна больш забяспечваючую работу. Але дух байца заставаўся ў чалавеку-актору, выхаваным у баявых традыцыях Чырвонай Арміі. Гэты дух зрабіў В. О. Владамірскага пажыццёвым работнікам мастацтва працоўных, які ўсяго сябе, усё сваё жыццё без астатку і да канца аддаў тэатру.

Па хадатайніцтву байцоў і каманднага складу часцей Менскага гарнізона ў 1933 годзе актору Владамірскаму прысвойваецца званне заслужанага артыста рэспублікі. Чаму гэта хадатайніцтва ўзялі на сябе вайсковыя часці? Ды таму, што В. О. Владамірскі да канца застаўся акторам Чырвонай Арміі, які не парваў, а, наадварот, узмацніў свае сувязі з чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасцю.

З вялікім здавальненнем грамадскасць часцей Чырвонай Арміі сустрэла Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб прысваенні В. О. Владамірскаму звання народнага артыста БССР.

— Гэта наш, чырвонаармейскі актор, — гавораць байцы. — Актор байцоў, актор, які добра ведае свіст куль і радасць перамогі ў баю.

**

Мінула шмат год, — каля дваццаці. Я дагэтуль памятаю маладога чалавека, бландзіна ў шэрай студэнцкай куртцы — актора трупы 2-га армейскага тэатра Владзіміра Владамірскага. І здаецца, ён не змяніўся. І зараз ён такі-ж рухавы, вясёлы, жыццёрадасны — зусім баец Чырвонай Арміі, толькі час пабяліў валасы. Ну, ды не ў сівізне справа, — справа ў сэрцы і пачуццях, а тое і другое ў яго маладыя, сам ён боездольны, і калі грымне вайна, калі загрыміць бой — народны артыст Владамірскі зноў паявіцца на сцэне армейскага тэатра, каб сваім мастацтвам выклікаць захапленне байцоў, буру, якая стварае адвагу і гераізм.

Такія людзі, выхаваныя Чырвонай Арміяй. Такі В. О. Владамірскі.

З найвялікшым здавальненнем адзначаем мы поспехі В. О. Владамірскага за перыяд з 1933 па 1938 год і шчыра радуемся за чалавека, творча ярка расцвіўшага, які сваімі здольнасцямі прыцягвае ўвагу шырокай грамадскасці. А тое, што чалавек гэты выйшаў з асяроддзя байцоў на фронце,— з'яўляецца яшчэ большай гордасцю. Зараз гледачы бачаць яго ў дзесятку ролей, у якія ён укладвае ўсё сваё ўменне актора, усё сваё майстэрства ствараць поўнакроўныя, пераканаўчыя вобразы («Капітанская дачка» — Пугачоў, «Ваўкі і авечкі» — Мурзавецкі, «Апошнія» — Каламійцаў).

У 1933 годзе Владамірскі, перагружаны работай у тэатры, знаходзіў магчымасць штодзённа кіраваць драмкалектывам Н-скай кавалерыйскай часці. У 1934 годзе, узяўшы чарговы адпачынак, ён жыве агульным жыццём з гэтай часцю, прымае ўдзел у тактычных занятках. Расце талент, мацнее сувязь актора з Чырвонай Арміяй.

В. О. Владамірскі належыць да ліку лепшых, перадавых людзей Сталінскай эпохі, якія свядома нясуць сваю вялікую культуру, сваю творчасць на карысць народа і на абарону краіны.

Прысваенне В. О. Владамірскаму высокага звання народнага артыста БССР — не толькі гордасць і радасць актора, а — гордасць усёй грамадскасці, гордасць інтэлігенцыі і вялікае здавальненне чырвонаармейскай грамадскасці.

Трэба спадзявацца, што сувязь народнага артыста БССР В. О. Владамірскага з байцамі Чырвонай Арміі ўзмацніцца яшчэ больш, што, безумоўна, адыграе значную ролю ў далейшым творчым росце яго — актора, выхаванага Чырвонай Арміяй. В. ГЛАЗЫРЫН.

Прэм'ера Палескага тэатра

Малады калектыў Палескага абласнога тэатра пачаў сур'ёзную работу па ўзбагачэнню свайго рэпертуару лепшымі творамі савецкай драматургіі і класічнай спадчыны. У 1939 годзе тэатр мяркуе паказаць свайму гледачу п'есы: «Не было ні гроша» А. Астроўскага, «Каварства і любоў» Ф. Шылера, «Басса Жалезнова» М. Горкага, «Зямля» Н. Вірты, «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, «Непакойная старасць» Л. Рахманава, «Сузор'е гончых псоў» К. Паустоўскага, «Генеральны консул» бр. Тур і Л. Шэйніна, «Таня» Арбузава. Пастаноўка названых п'ес — надзвычай складаная і адказная для маладога тэатра задача. Вырашэнне яе патрабуе вялікай дапамогі тэатру як з боку Упраўлення па справах мастацтваў, так і з боку ўсёй грамадскасці. Патрэбна ўмацаваць і папоўніць трупу тэатра, клапатліва дапамагаць творчаму росту калектыва. Дагэтуль патрэбнай увагі ад Упраўлення па справах мастацтваў Палескі тэатр не адчуваў. Адзін з паказчыкаў гэтага — тое, што тры спектаклі, выпушчаныя тэатрам у канцы 1938 года, не прагледжаны нават Упраўленнем.

Апошняя работа Палескага абласнога тэатра — пастаноўка п'есы К. Трэнёва «Любоў Яравая» сведчыць аб сур'ёзнай рабоце калектыва і аб здольнасці яго ўзбагаціць свой рэпертуар названымі вышэй творамі.

«Любоў Яравая» — адзін з лепшых твораў савецкай драматургіі, які карыстаецца вялікай любоўю і папулярнасцю ў нашага гледача. І трэба толькі вітаць Палескі тэатр за тое, што ён не спужаўся цяжкасцей і сіламі маладога калектыва здолеў паставіць на сваёй сцэне гэты спектакль.

Спектакль уваскрашае перад гледачом старонкі нашага герaічнага мінулага — грамадзянскай вайны. Пастаноўшчык спектакля — малады рэжысёр В. В. Пацехін накіраваў акторскі калектыў па правільнаму шляху — па шляху стварэння рэалістычнага спектакля, праўдзівага раскрыцця незабыўных вобразаў трэнёўскай п'есы. У спектаклі відаць удумлівая работа і рэжысёра і акцёраў.

Нам здаецца толькі, што пастаноўшчык спектакля недастаткова поўна прадумаў і ацаніў вобраз Любові Яравой, цэнтральны вобраз п'есы, і таму часам некалькі затушоўвае яго, імкнучыся як мага больш і залішне выпукліць і завайстрыць канфлікт Кошкін — Яравы. Але здольная актрыса Е. Н. Даніловіч у ролі Яравой перамагае гэту неўдасканаленасць замыслу пастаноўшчыка і стварае яркі вобраз настаўніцы — інтэлігенткі, якая прайшла складаны шлях барацьбы, знайшла ў сабе сілы перамагчы асабістыя супярэчнасці, прынесці сваё каханне ў афяру абавязку, доўгу і канчаткова, назаўсёды стаць у рады байцоў рэвалюцыі.

Проста і шчыра, знайшоўшы шмат цікавых характэрных дэталей, выконвае Н. Д. Салаўёў ролю камісара Кошкіна. Заслугоўвае станоўчай ацэнкі і ігра В. П. Галкіна ў ролі Швандзі.

Большага трэба патрабаваць ад актора Ю. М. Сурыкава, выканаўца ролі Яравога. Актор недастаткова поўна раскрыў вобраз, усю сутнасць і якасць Яравога. У Сурыкава ёсць пэўны акторскі вопыт і здольнасці. Пры далейшай рабоце ён безумоўна здолее па-сапраўднаму «жыць у вобразе».

Паспяхова выконваюць свае ролі актрысы Л. А. Даноўская (Панава), М. Н. Варонiна (жонка прафесара Горнастаева), А. Д. Качынская (Дунька). У ігры кожнай з іх відаць правільнае разуменне ствараемага вобраза, праўдзівая трактоўка яго, свежасць інтэрпрэтацыі ролі.

Радуюць у гэтым спектаклі ўдачы маладых актораў, якія ў невялікіх, часам эпізадычных ролях стварылі жыццёва-праўдзівыя вобразы. Гэта — артыст А. І. Лазароўскі ў ролі вартаўніка, былога «служкі божага» Чырэ, ўпершыню выступаючая на сцэне артыстка О. А. Васілеўская ў ролі сялянкі Мар'і.

Поруч з гэтым ёсць і недаравальныя няўдачы, якія сведчаць аб павярхоўнай рабоце актораў над вобразам. Яркі прыклад гэтага — актор В. А. Касуха ў ролі тэлефаніста Коласава. Замест юнака, лятуценніка, які шукае свайго месца ў рэвалюцыі, мы бачым нязграбнага і дакучаючага чалавека, які застаецца незразумелым гледачу. Пячатка прымітыву, недастатковай прадуманасці ляжыць на рабоце актора Е. Міленка (палкоўнік Малінін) актора І. Прушака (палкоўнік Кутаў). Відаць, мала працаваў з гэтымі маладымі акторамі і рэжысёр.

Вялікай агульнай заганай спектакля і работы большасці выканаўцаў з'яўляецца адсутнасць клопатаў аб культуры мовы. А гэта зніжае і культуру спектакля. Некаторыя акторы (як Ю. М. Сурыкаў) здзіўляюча неахайна ставяцца да вымаўлення слоў, да авалодання беларускай лексікай. Усяму калектыву Палескага тэатра трэба шмат працаваць над павышэннем культуры мовы.

Пры афармленні спектакля «Любоў Яравая» мастак С. В. Лук'янаў, які плённа працуе ў Палескім тэатры, дапусціў, на нашу думку, істотную памылку. Ён залішне прыхарошыў і дэкарацыі і касцюмы, што ў рэалістычную трактоўку спектакля ўносіць непатрэбныя элементы ўмоўнасці.

Заганы, што ёсць у спектаклі, тэатр безумоўна здолен выправіць, тым самым яшчэ вышэй узняць мастацкую вартасць сваёй прэм'еры.

Спектакль «Любоў Яравая» сведчыць аб бясспрэчных здольнасцях маладога калектыва. І трэба пажадаць яму далейшых творчых поспехаў — стварэння новых спектакляў, задавальняючых высокія культурныя патрабаванні гледачоў Палесся.

Ю. РУДЗЬКО.

УЗМАЦНІЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ

У гэтым годзе прадстаіць дэкада беларускага мастацтва ў Маскве. Гэта ставіць перад усімі арганізацыямі і работнікамі музычнага фронта задачу рашучага ўзмацнення падрыхтоўкі гэтай знамянальнай для гісторыі развіцця беларускага мастацтва даты. Тэмпы падрыхтоўкі да дэкады, якія мы наглядаем зараз і ў музсектары Упраўлення па справах мастацтваў, і ў Тэатры оперы і балета, і ў Філармоніі, і ў Саюзе кампазітараў — не могуць задаволіць грамадскасць.

Затрымка ў выпрацоўцы дакладнага плана і праграм выступленняў стварае вялікія перашкоды для работы Філармоніі. У Тэатры оперы і балета інтэнсіўна разгарнулася праца толькі па падрыхтоўцы оперы «Міхась Падгорны» (кампазітара Цікоцкага). У сэнсе падрыхтоўкі да пастаноўкі оперы «Дрыгва» (кампазітар Багатыроў) і балета «Салавей» (кампазітар Крэшнер) зроблена вельмі і вельмі мала. Дрэнна абстаіць справа з узбагачэннем рэпертуару тэатра. Кіраўніцтва тэатра чамусьці забылася на гэта. А задачы дэкады і прыклад выступленняў Грузіі, Азербайджана патрабуюць пашырэння пастановачнага плана беларускіх опер і балетаў. Нездавальняючае становішча з кадрамі ў Філармоніі і Оперным тэатры, дзе рад калектываў (аркестр, хор, цымбальны ансамбль, ансамбль песні і пляскі) адчуваюць патрэбу ў даўкамплектаванні, а некаторыя і ў рэарганізацыі.

Вялікая работа прадстаіць беларускім савецкім кампазітарам па напісанню арыгінальнай музыкі, па збіранню і апрацоўцы савецкага фальклору, па падбору твораў, але і гэта частка работы знаходзіцца яшчэ ў «зачаткавым» выглядзе.

Падрыхтоўку да дэкады павінны весці не толькі тыя калектывы, якім выпадае пачэсная роля выступаць на дэкадзе, але і ўсе музычныя арганізацыі і ўстановы. Дэкада павінна паслужыць стымулам для агульнага ўздыму беларускай музыкі, творчых, выканаўчых і педагагічных кадраў, яна павінна стаць сапраўдным святам беларускай музычнай культуры.

Неабходна ў рэспубліканскім маштабе правесці рад мерапрыемстваў: нараду музычнага актыва, конкурс на лепшае выкананне твораў беларускіх кампазітараў, канцэрты лепшых прафесіянальных і вучнёўскіх сіл гор. Менска, конкурс па збіранню і запісу савецкага музычнага фальклору і г. д. Трэба разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да дэкады паміж усімі творчымі і выканаўчымі работнікамі, вылучыць кадры па збіранню і запісу фальклору. Трэба арганізаваць раённыя і абласныя фестывалі музыкі, асноўнай задачай якіх паставіць папулярызацыю і прапаганду беларускай музыкі; правесці выезды ў калгасы, на прадпрыемствы; наладзіць канцэрты з выстаўкамі і кансультацыямі і г. д. Усе гэтыя мерапрыемствы будуць садзейнічаць поспеху падрыхтоўкі дэкады і ў правядзенне іх уключыцца кожны работнік музычнага фронта. Падрыхтоўка да дэкады павінна яшчэ больш актывізіраваць шэфства работнікаў мастацтваў над мастацкай самадзейнасцю.

Партыя і ўрад аддаюць велізарную ўвагу росту нацыянальных культур. Задача кожнага з нас — прыкласці ўсе свае сілы, веды, энергію к таму, каб ператварыць дэкаду ва ўсенароднае свята беларускай культуры, квітнеючай пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

„ЛЕЙБКЕ-САЛДАТ"

(У Дзяржаўным Яўрэйскім тэатры Беларусі)

П'еса «Лейбке-салдат» — першы драматургічны твор маладога пісьменніка Ісэра Левіна.

Дзея п'есы адбываецца ў мястэчку на Беларусі ў часе імперыялістычнай вайны. Перад маладым аўтарам-камсамольцам, які ледзь памятае той час, стаяла задача—дакладна пазнаёміцца з матэрыялам, з жыццём і бытам мястэчка да рэвалюцыі. Аўтар з гэтай задачай справіўся.

Драматург паказвае працоўных яўрэяў і беларусаў—возчыкаў лесу (возакес). Трэба адзначыць, што ён дасканала ведае быт і жыццё гэтай праслойкі працоўных мястэчка. Таму і людзі выйшлі жывымі і мова ў іх народная, сакавітая. Але ў мове сустракаюцца вульгарныя словы. Яны стракацяць ва ўсёй п'эсе, засталіся і ў спектаклі. У п'есе ёсць і іншыя значныя недахопы. Сюжэт яе раскіданы, некаторыя сцэны даўгія, ёсць залішне вялікія маналогі.

Калектыў тэатра і асабліва рэжысёр спектакля засл. арт. рэсп. Трэпель шмат зрабілі для таго, каб недахопы п'есы выправіць, і дабіліся значных поспехаў.

Галоўны герой п'есы — Лейбке. Аб характары Лэйбке вельмі трапна гаворыць яго нявеста Рохеле:

— Ой, Лейбке, гэтакі ты дзікі, але на ўсё здольны. Здаецца, што на свеце няма другога такога. Прыгожы, лесарубы яго любяць і ўсе баяцца яго. Яго аплявуху будзеш памятаць многія годы. Пабіцца ён ахвотнік, але я яго люблю за гэта. Ен шчыры чалавек. Што на розуме, тое і на языку.

Ролю гэтага сардэчнага, працавітага местачковага хлапца выконвае артыст Моін. Артыст стварае поўнакроўны і пераканаўчы вобраз Лейбке, які, дарэчы, ярка напісан і аўтарам.

Вельмі трапна паказвае тав. Моін рэўнасць Лейбке да Рохеле і яго нянавісць да сына падрадчыка. Глыбока пераканаўча паказана гэта нянавісць маладога лесаруба да Ешке і яго сына.

Лейбке энергічны і вельмі рашучы хлапец. Адначасова — глыбока лірычны, непасрэдна наіўны. І Лейбку сапраўды любіць глядач.

Добрае ўражанне пакідае Рохеле. Засл. арт. рэсп. Аронычк стварыла выдатны, надзвычай цікавы вобраз местачковай дзяўчыны. Рохэле больш дзелавітая, чым Лейбкэ, і разумее больш за яго. Яна гаворыць бальшэвіку Лёкуму, брату Лейбке, што ёсць многае, аб чым яна не гаворыць Лейбке. Яна разбіраецца ў сусветных падзеях. Рохеле ціхая, шчырая дзяўчына з народа.

У спектаклі паказан рад поўнакроўных вобразаў працоўных яўрэяў дарэвалюцыйнай Беларусі, паказана шчыльная сувязь беларускіх і яўрэйскіх працоўных.

У спектаклі ёсць цікавы вобраз старога беларуса Ігната, суседа дзеда Шаі. Разам з усімі яўрэйскімі і беларускімі лесарубамі Ігнат ненавідзіць арандатара, лесапрамысленіка, эксплаататара Ешкэ. У крытычны момант, калі трэба схаваць ад жандармерыі бальшэвіка Лёкума, Ігнат першым адгукваецца, што хоча схаваць яго, як роднага сына, у сваім доме.

Вось Ігнат сядзіць на ўскраі лесу і грае на дудцы,—яму даверылі стаяць на варце і паказваць рабочым і сялянам дарогу на падпольную сходку, арганізаваную бальшэвіцкім камітэтам. Малады актор тав. Ракаўшчык добра выконвае ролю Ігната.

Бальшэвік Лёкум — любімец усіх возчыкаў лесу. Прастата і сур'ёзнасць бальшэвіка Лёкума перададзена акторам Германам пераканаўча і вельмі праўдзіва. Лёкум такі-ж возчык лесу, як і ўсе астатнія. З увагай слухаюць возчыкі кожнае слова Лёкума, бачачы ў ім старэйшага і разумнейшага. Такім-жа ўспрымае Лёкума і глядач.

Наглядаецца ў гэтым спектаклі творчы рост артысткі Эстэр Аронычк у ролі хлапчука Нойехкэ. Нойехке — просты местачковы хлапчук з сям'і працоўных, поўны сардэчнай наіўнасці.

Яшчэ адна цэнтральная фігура ў

Лейбке — арт. МОІН, Рохеле—засл. арт. БССР АРОНЧЫК.

п'есе — Гецл. Гэта — чалавек сярэдніх год, жыццёрадасны, моцны. Гецл не любіць доўга разважаць над сваімі горасцямі. Маці Лейбке — Рэйзел гаворыць: «Гецл застаецца заўсёды тым-жа Гецл». Ролю Гецл добра выконвае сам аўтар п'есы тав. Левін.

Неабходна адзначыць добрае афармленне спектакля, зробленае мастаком Кіпнісам.

Акторы і пастаноўшчык—рэжысёр Трэпэль дапамаглі маладому аўтару і стварылі цікавы спектакль. Мы бачылі шмат спектакляў аб дарэвалюцыйным мястэчку, у гэтых спектаклях былі вобразы згорбленых, хілых людзей, паказваліся пакрыўленыя «шагалаўскія» хацінкі. Гэтыя спектаклі давалі зусім няправільнае ўяўленне аб народзе і аб народнай сіле.

Заслуга тэатра, паставіўшага п'есу «Лэйбке-салдат», у тым, што ён паказаў гледачу поўнакроўныя вобразы жыццёрадасных і моцных людзей — прадстаўнікоў народа. Спектакль пераканаўча паказвае гледачу глыбокую дружбу яўрэйскіх і беларускіх працоўных.

Х. МАЛЬЦІНСКІ.

НОВЫ ТВОР УКРАІНСКАГА ДРАМАТУРГА

Паэт-комсамолец К. Герасіменка напісаў п'есу «Ярына». Галоўны герой п'есы — Ярына ідзе разам з сынам са зброяй у руках змагацца супроць белапольскіх інтэрвентаў, уступае ў Чырвоную Армію. П'еса паказвае ўдзел жанчын у грамадзянскай вайне.

В. ГАЛЕНКА.

Кіеў.

ДА ВЫСТАЎКІ „ЛЕНІН І СТАЛІН— АРГАНІЗАТАРЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ"

24 лютага ў Доме мастака пачнецца нарада мастакоў, скульптараў, ткачых, вышывальшчыц, рэзчыкаў Менскай вобласці. Нарада прысвечана вынікам першага з'езда мастакоў БССР і задачам, якія стаяць перад мастакамі ў сувязі з падрыхтоўкай да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, дэкады беларускага мастацтва ў Маскве і выстаўкі «Ленін і Сталін — аранізатары беларускай дзяржаўнасці».

Як паведамляе Менскі абласны аддзел па справах мастацтваў, беларускай выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» будзе папярэднічаць выстаўка на тую-ж тэму ў абласным маштабе.

Абласны аддзел па справах мастацтваў арганізуе кансультацыю эскізаў і макетаў работ мастакоў-самавучак да выстаўкі 1940 года.

ПАСЯДЖЭННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ШЭЎЧЭНКАЎСКАГА КАМІТЭТА

19 лютага рэспубліканскі шэўчэнкаўскі камітэт абмеркаваў ход падрыхтоўкі да 125 гадавіны з дня нараджэння Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка.

Намечана, пачынаючы з 25 лютага, правесці ва ўсіх школах літаратурныя вечары, прысвечаныя памяці вялікага украінскага паэта. Узнята хадатайніцтва аб прысваенні імя Шэўчэнка адной з лепшых школ горада Менска. Камітэт абмеркаваў пытанні, звязаныя з правядзеннем у пачатку сакавіка сесіі Акадэміі навук БССР, прысвечанай 125-гадоваму юбілею Шэўчэнка.

На пасяджэнні зацверджан праект афармлення выстаўкі, прысвечанай Т. Г. Шэўчэнка. Выстаўка адкрыецца ў дні юбілея ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Леніна.

Для ўдзелу ў шэўчэнкаўскіх вечарах, якія адбудуцца ў абласных цэнтрах, выедуць народныя паэты-ордэнаносцы Янка Купала і Якуб Колас, паэты-ордэнаносцы Пятро Глебка і Пятрусь Броўка.

**

Украінскі пісьменнік Л. Балабон разам з артыстам эстрады Л. Прэдсловіе напісалі гістарычную п'есу, прысвечаную Т. Г. Шэўчэнка, — «Рэве та стогне Дніпр шырокі». Дзея адбываецца ўлетку 1861 года ў сяле каля Канёва. У часе так-званага вызвалення сялян у гэтым сяле адбываецца паўстанне. Імя Шэўчэнка становіцца сімвалам у барацьбе сялян, якія не вераць у тое, што вялікі народны паэт памёр.

„ЛЯ ЛУКАМОР'Я" У НОВЫМ ТЭАТРЫ ЮНАГА ГЛЕДАЧА

Ленінградскі драматург Д. Дэль напісаў новую п'есу аб пагранічніках «Ля Лукамор'я». Днямі новы ленінградскі Тэатр юнага гледача паказаў прэм'еру гэтай п'есы. Юная аудыторыя з выключнай цікавасцю сустракае спектакль, у якім паказваецца, як савецкія людзі раскрываюць майстэрска замаскіраваных шпіёнаў і дыверсантаў.

Спектакль пастаўлен Т. Сойнікавай і вельмі красачна афармлен мастаком Е. Якунінай.

МІКЕЛЬАНДЖЭЛО БУОНАРОТЦІ

1564—1939

МІКЕЛЬАНДЖЭЛО—завяршаючае звяно ў ланцугу надзвычайных перамог, атрыманых мастацтвам эпохі Адраджэння. У мастацтве Мікельанджэлю ўсе лепшыя ідэалы таго часу атрымалі найвышэйшае выражэнне. Ідэі гуманізма, бясконцая вера ў чалавечыя здольнасці, у сілу чалавечага розуму, праслаўленне чалавека, як дасканалейшага стварэння прыроды, якое ўвасабляе ў сабе ідэал характва,—вось аснова мастацтва Адраджэння і яго геніяльнага прадстаўніка — Мікельанджэло. Чалавек, яго гераічная дзейнасць, яго радасці і пакуты, яго мужнасць, яго душэўная і цялесная прыгажосць, яго ўнутраная магутнасць, непахісная воля да барацьбы і перамогі, — стаяць у цэнтры ўвагі Мікельанджэло. Усім дасягненням мастацтва эпохі Адраджэння Мікельанджэло ў сваёй творчасці надаў новую сілу, усё набыло ў Мікельанджэло тытанічны, велічны воблік, усяму ён надаў магутнае, гераічнае гучанне. Творчасць Мікельанджэло — гэта гістарычны гімн на славу чалавека. Яго чалавек — гарманічна, усебакова развітая істота, у якой цялесная, фізічная прыгажосць і сіла знаходзіцца ў поўным адзінстве з глыбокай унутранай сілай, кіпучымі страсцямі, магутнымі думамі. Ні адзін скульптар ні да Мікельанджэло, ні пасля яго не стварыў такіх глыбока адухоўленых вобразаў, насычаных унутраным жыццём, што свіціцца ў кожнай рысе твару, у кожным мускуле, у кожным жэсце, якія стварыў Мікельанджэло ў сваёй скульптуры.

Мікельанджэло — чалавек рознабаковага, універсальнага даравання. У першую чаргу ён скульптар, што і сам ён заўсёды падкрэсліваў, падпісваючыся пад сваімі пісьмамі: «Мікельанджэло, скульптар з Фларэнцыі». Але адначасова ён не менш вялікі жывапісец, стваральнік грандыёзнейшых у свеце сценных роспісаў (фрэсак), утварыўшых цэлы пераварот у жывапісу, ён майстар чаруючых станкавых карцін, аўтар вялікай колькасці рысункаў, накідаў. Мікельанджэло — вялікі архітэктар, стваральнік велізарных архітэктурных ансамбляў, тварэц каласальнейшага будынка свайго часу — сабора Пятра ў Рыме. Мікельанджэло — вопытнейшы ваенны інжынер, майстар абаронных умацаванняў, вынаходнік прылад абароны. Ен найтанчэйшы і найглыбейшы паэт, аўтар санетаў, якім сучаснікі прысвячалі навуковыя даклады. Вялікі французскі пісьменнік Стэндаль, прачытаўшы адзін з санетаў Мікельанджэло, ускліукнуў: «Шчаслівая была-б Італія, калі-б у яе было больш такіх паэтаў».

І разам з тым Мікельанджэло — страсны палітычны баец, прыхільнік перадавых ідэй свайго часу, абаронец свабоды, рэспублікі, барацьбіт супроць тыраніі і нацыянальнага заняволення.

Вобразы Мікельанджэло — гэта заклік да дасканаласці, да гераізма, да выхавання ў сабе духу грамадзянскасці. Гэта сімвалы лепшых імкненняў чалавецтва эпохі Адраджэння, якая адкрыла неабсяжныя гарызонты развіццю чалавечай мыслі, раскрыццю чалавекам сваіх здольнасцей, удасканаленню сваёй індывідуальнасці. Усё гэта робіць мастацтва Мікельанджэло вечна юным, сцягам усяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва. Іменна пагэтаму так па-сучаснаму гучыць мастацтва Мікельанджэло ў нас, у краіне сацыялізма.

**

Мікельанджэло быў сынам рэспубліканскай Фларэнцыі, найбольш перадавога горада тагочаснай Італіі, горада з даўняю мастацкаю традыцыяй. У ваколіцах гэтага горада, у Капрэзе, у сям'і чыноўніка тамажні нарадзіўся 6 сакавіка 1475 года Мікельанджэло.

Яшчэ на школьнай лаве Мікельанджэло пачаў захапляцца мастацтвам. Аб тым, што ўяўляў сабою Мікельанджэлю — скульптар у годы навучання, даюць уяўленне дайшоўшыя да нас дзве яго скульптурных работы — барэльефы «Мадонна ля лесвіцы» і «Бітва кентаўраў».

У сярэдзіне 1496 года Мікельанджэло накіраваўся ў Рым, дзе пражыў да 1501 года. Тут ім створаны дзве работы — «Вакх» і «Пьета». Апошняя работа ўтварыла на сучаснікаў велізарнае ўражанне.

У перыяд з 1501 да 1505 года Мікельанджэло зноў на радзіме, дзе творыць адзін за другім свае шэдэўры. У 1501 годзе ён атрымаў заказ вылепіць гіганцкую статую Давіда. Сусветна вядомая цяпер статуя паказвае Давіда, слаўнага пераможцу Галіафа, спакойна пазіраючым на свет, поўным упэўненасці ў сваёй сіле. Яго правая рука апушчана, левая падтрымлівае прашчу,

якая ляжыць на плячы, позірк пільна скіраван уперад. У гэтай статуі Мікельанджэло адмовіўся ад якіх-бы там ні было дадатковых атрыбутаў, ён сканцэнтрыраваў усю сваю ўвагу на чалавечай фігуры і дабіўся магутнай выразнасці чалавечых форм. Адной агаленай фігурай мастак здолеў выразіць ідэю грамадзянскага абавязку і магутнасці, здолеў ператварыць біблейскага Давіда ў пільнага вартавога Фларэнцыйскай рэспублікі, гатовага ў любую мінуту адбіць дзёрзкі напор ворагаў, парабашчальнікаў. Нездарма Давід стаў сімвалам свабоды. Іменна так і ўспрымалі гэтую статую сучаснікі скульптара.

У «Давідзе» разгарнуўся ва ўсёй сваёй магутнасці талент Мікельанджэло. Строгасцю форм і велічнасцю вызначаецца таксама «Мадонна з Брюгге» (1503—1504).

У гэты-ж час Мікельанджэло напісаў славутую «Мадонну Доні» і «Бітву пры Кашыне». «Мадонна Доні» — адзіная дайшоўшая да нас станкавая карціна Мікельанджэло.

«Давід», «Мадонна в Брюгге», «Мадонна Доні», «Бітва пры Кашыне», змяшчаюць ужо ўсе характэрныя рысы развітай творчасці Мікельанджэло. Як ваяцель і як жывапісец — ён манументаліст, пясняр грандыёзнага гераічнага, які шукае праяўленняў вялікай сілы, вялікіх страсцей, вялікіх пачуццяў.

У 1528 годзе народ Фларэнцыі паўстаў супроць тыранічнай дэспатыі дома Медзічы, якія ператваралі Фларэнцыйскую рэспубліку ў сваю вотчыну. Народ выгнаў з горада ўсемагутных Медзічы і пачаў умацоўваць горад, рыхтавацца да абароны. У гэтых падзеях праявіліся ў Мікельанджэло новыя выключна яркія рысы. Да гэтага часу мы ведалі яго толькі вялікім мастаком, які цалкам захоплен сваёй працай. У 1528 годзе Мікельанджэло апынуўся ў першых радах паўстаўшага народа. Ён быў атулен вышэйшым давер'ем народа, атрымаўшы адказную пасаду начальніка ўсіх умацаванняў горада.

У дні нацыянальнага і рэспубліканскага абуджэння Мікельанджэло з энтузіязмам уключыўся ў работу па абароне Фларэнцыі. Ён будаваў умацаванні, вынаходзіў арыгінальныя канструкцыі абаронных машын.

У жніўні 1530 года рэспубліканская Фларэнцыя пала. У горад уварваліся азвярэлыя ўсмірыльнікі, пачаліся масавыя казні.

Рамен Ралан у сваёй манаграфіі аб Мікельанджэло гаворыць: «Ён зведаў найвялікшыя бядоты, якія могуць толькі выпасці на долю чалавека. Ён бачыў заняволенне сваёй радзімы. Пры ім Італія апынулася пад ігам чужаземцаў і рабству гэтаму не было відаць канца; ён бачыў, як памірала свабода, як знікалі адзін за другім людзі, якіх ён любіў. Ён бачыў, як згасалі адзін за другім светачы свабоды».

У 1534 годзе Мікельанджэло атрымаў заказ на роспіс алтарнай сцяны Сікстынскай капелы, дзе Мікельанджэло ўжо раней распісаў столь. Цікава, што тэмай сваёй фрэскі Мікельанджэло ўзяў «Страшны суд» —, тэму адплаты, пакарання. Над гэтай грандыёзнай фрэскай мастак працаваў 8 год. У 1541 годзе адбылося яе ўрачыстае адкрыццё. Мастак стварыў карціну найвялікшага трагічнага напружання, разгарнуў з небывалай сілай сцэны заўзятай барацьбы, паказаў усе віды жахлівых пакаранняў і мучэнняў, якія толькі існуюць на свеце. Ён сабраў у адно і агаліў усе парокі сучаснага грамадства і паказаў, якога пакарання, якой кары заслугоўваюць здрада, паклёп, распуста. У сваім «Страшным судзе» Мікельанджэло расправіўся з прадстаўнікамі «века ганьбы, распусты і злачынстваў». Сваім судом ён як-бы сімвалічна прадсказаў іх лёс. Мікельанджэло выступае тут перад намі як першы прадстаўнік крытычнага, выкрываўчага рэалізма ў жывапісу новага часу.

Майстэрства Мікельанджэло, як майстра паказу чалавечага цела, стаіць у гэтай фрэскі на недасягальнай вышыні. Ні адзін мастак да Мікельанджэло не паказваў з такой свабодай і ўпэўненасцю чалавека. Для Мікельанджэло няма нічога немагчымага. У яго адсутнічае ўсякая звязанасць, залежачая ад абмежаванасці сродкаў: нішто не ўтрымлівае яго ў якіх-бы там ні было рамках умоўнасці, схемы. Ён дае чалавека з такой свабодай, што здаецца —сама прырода гаворыць яго мастацтвам. У гэтых адносінах Мікельанджэло — вяршыня мастацтва Адраджэння, яго творчасць — завяршэнне найбольш каштоўных, найбольш важных заваёў мастацтва гэтай эпохі.

У апошнія годы жыцця Мікельанджэло ў асноўным быў заняты праектыраваннем і пабудовай архітэктурных збудаванняў. У 1546 годзе ён быў прызначан галоўным інжынерам па дабудове пачатага геніяльным архітэктарам Брамантэ сабора Пятра ў Рыме, грандыёзнейшага збудавання той эпохі.

Памёр Мікельанджэло 18 лютага 1564 года ў Рыме.

Са смерцю Мікельанджэло адышоў апошні вялікі мастак эпохі Адраджэння. Ні адна наступная эпоха не вылучыла гэткага ўсёабдымнага генія, якім быў Мікельанджэло. Былі пасля яго вялікія жывапісцы, скульптары, архітэктары, але не было такога генія, які спалучаў-бы ў сабе адначасова ўсе гэтыя якасці. Не было ні аднаго майстра, які-б з такой сілай, дасканаласцю і харастбом запечатлеў гераічныя вобразы чалавека.

К. СІТНІК.

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ БССР

Спецыяльная камісія Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР прыступіла да прыёмкі карцін і скульптур для мастацкай галерэі БССР. Прынята ўжо частка карцін і скульптур па Менску — да 500 экспанатаў. У іх лік уваходзяць карціны Рэпіна («Партрэт Лявіцкага», «Партрэт Собінава»), Серова («Жаночы партрэт»), Макоўскага, Верашчагіна, Каровіна, Ярашэнка, Бродскага, Орлова Клевера, Пэна («Старык», «Старуха», «На судзе»), Волкава, Грубэ і інш.

Заходне-еўрапейскія майстры прадстаўлены копіямі карцін Рэмбрандта і іншых майстроў галандскай школы, копіямі Рафаэля, радам карцін майстроў італьянскай школы XVII — XVIII стагоддзяў. Ёсць узоры класічнай скульптуры: дзве рэчы Праксіцеля — «Гермес» і «Венера» (гіпсавыя злепкі), гіпсавы злепак рымскай статуі «Апоксімена» работы Лізіппа, тры гіпсавых злепкі са статуй групы «Ніобід» работы Скапола і інш.

Карцінная галерэя, згодна рашэння ўрада, будзе размешчана ў будынку, які зараз займае Акадэмія навук БССР.

Апрача экспанатаў, сабраных у БССР, карцінная галерэя атрымае рад карцін і скульптур ад Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў.

У бліжэйшы час камісія па прыёмцы экспанатаў выязджае ў Гомель, Віцебск і Магілёў для выяўлення і прыёмкі карцін і скульптур, якія знаходзяцца ў гэтых гарадах.

Для рэстаўрацыі карцін і скульптур для галерэі запрошан мастак Віяр.

ВЕЧАРЫ ЯЎРЭЙСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ У МАСКВЕ

19 лютага ў Маскву для ўдзелу ў вечарах яўрэйскай літаратуры выехала група яўрэйскіх пісьменнікаў БССР. У складзе групы тт. З. Аксельрод, Г. Камянецкі, Э. Каган, Х. Мальцінскі.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Уп. Галоўлітбела № Р—875.